ЕЛАРУСКАЯ
ДБОТНІЦА і СЯЛЯНКА
ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!
ЛК
19

ГПБ Ср.

Работніцы і батрачкі Польшчы ў перадавых радох барацьбы з буржуазіяй.

8 сакавіка—дзень міжнароднай салідарнасьці працоўных жанчын усяго сьвету. Пад сьцягам Камуністычнага Інтэрнацыяналу—да перамогі сусьветнага Кастрычніка.

Клясавая барацьба ў Польшчы ўзрывае ўсё больш глыбокія глыбы сацыяльных слаёў. Паказальным зьяўляецца ўцягваньне шырокіх слаёў працоўных жанчын у яе.

Работніцы ўдзельнічаюць у перадавых радох забастовачнага руху краіны і ў масавых палітычных выступленьнях пралетарыяту пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі Польшчы.

За апошні час усё больш часты выпадкі актыўных выступленьняў жон рабочых.

У Дамброўскім басэйне гарнякі рашылі явачным парадкам заваяваць сабе 8-гадзінны рабочы дзень, уключаючы ў яго час з моманту спуска пад зямлю да моманту выхаду на паверхню зямлі.

Каб зламіць гэта рашучае заваяваньне гарнякоў, прадпрыёмцы заперлі іх у адну з шахт, калі яны на поўгадзіны раней кінулі працу.

Але плян прадпрыёмцаў ня ўдаўся. На дапамогу рабочым кінуліся жоны гарнякоў, якія стаяць на варце заваёў рабочых.

Вялізным натаўпам накінуліся яны на ўваход у шахту, зламалі дзьверы і прымусілі выпусьціць рабочых.

Стачачны рух захапіў і сельска-гаспадарчых рабочых.

Усё больш разгортваецца рух бядняцкіх мас супроць паноў і фашысцкай дзяржавы. У першамайскіх дэманстрацыях гэтага году сялянкі польскіх вёсак састаўлялі перадавыя групы калён, якія накіроўваліся ў горад, каб уліцца ў адзіную пралетарскую маніфэстацыю. Ва ўсіх астатніх баях гэтага году яны таксама ідуць у перадавых шэрагах.

Асабліва абвостраную форму клясавая барацьба прыняла ў вёсках заходняй Украіны. Першы раз пасьля 1924 году тут разгарнуліся масавыя забастоўкі батракоў. Вялізную колькасьць сярод іх складаюць батрачкі.

Яны былі асноўнай сілай забастоўкі: арганізавалі стачачныя камітэты, удзельнічалі ў пікетах, склікалі сходы, накіроўвалі дэлегацыі ў іншыя паветы аб далучэньні да забастовак і г. д.

З мэтай зламіць сапраўціўленьне работніц і рабочых улада навадніла шэраг маёнткаў пешай і коннай паліцыяй. У вёсцы Навасілкі Тамашэўскага павету, былі арыштаваны рабочыя—Сьмілка, Грыня і Зазуля.

Сяляне пыталіся адбіць іх, але былі разагнаны паліцыяй.

У стычцы з паліцыяй асобую актыўнасьць і баявы пад'ём праявілі сялянкі.

Паліцыя, баючыся аслабаненьня арыштаваных закавала іх у кандалы і павезла ў павятовы горад Порунджы. Пры папытцы другі раз аслабаніць арыштаваных былі цяжка паранены іх жоны Стэпаніда Шчэрба і Алена Земніцкая.

У вёсцы Поцек, Раўскага павету, паліцыя ўварвалася ў хату бязьзямельнага селяніна Васіля Ліпчака. Яго ня было ў хаце. Паліцыя арыштавала яго 14-гадовага сына.

Хлапчука бязьлітасна білі, патрабуючы, каб ён указаў месца, дзе знаходзіцца забастовачны камітэт.

Гэта зьверская расправа выклікала надзвычайнае недавольства сялянак, выхавала ў іх яшчэ большую ненавісьць да капіталістычнай улады.

Гэта толькі асобныя моманты, бязьлітаснай клясавай барацьбы ў Польшчы.

Пад кіраўніцтвам КПП пралетарыят Польшчы падыходзіць да рашучых баёў, да зьвяржэньня фашысцкай дыктатуры буржуазіі.

Перадавыя работніцы горада і вёскі ўсё большымі масамі ідуць у спаяныя баявыя шэрагі пралетарыяту, вядучы за сабой астатнія масы працоўных жанчын.

З. Д.

6 сакавіка — дзень сумеснай барацьбы рабочых і беспрацоўных усяго сьвету.

Крызіс у капіталістычнай гаспадарцы ў сучасны момант значна абвострыўся.

Нават Амэрыка, дзе капіталізм да апошняга году дасягнуў найбольшага росквіту, перажывае цяпер найбольш глыбокі крызіс.

Крызіс—выклікае скарачэньне прамысловасьці, нябывалы рост беспрацоўя.

У аднэй Амэрыцы маецца ў сучасны момант 6 мільёнаў беспрацоўных, у Нямеччыне 3½ млн., у Польшы 4 мільёны, у Ангельшчыне 2 мільёны.

Па прыблізным падлікам ва ўсіх капіталістычных краінах маецца цяпер 20 мільёнаў беспрацоўных. 20 мільёнаў беспрацоўных перажываюць голад і холад.

Рабочых, якія яшчэ працуюць, чакае тое-ж самае. Зарплата рабочых скарачаецца, шмат дзе працуюць няпоўны тыдзень.

Дапамога беспрацоўным усё памяншаецца.

Пагэтаму ў апошнія тыдні значна пашырыўся рух беспрацоўных, якія разам з фабрычнымі рабочымі выступаюць на барацьбу з буржуазіяй.

Дэманстрацыі і „галодныя паходы“ ва ўсіх капіталістычных краінах Эўропы паказваюць рашучасьць да барацьбы і пралетарскую салідарнасьць рабочых і беспрацоўных.

У сучасны момант міжнародная барацьба з беспрацоўем—важнейшая палітычная задача пралетарскага руху.

Камінтэрн апублікаваў адозву да ўсіх рабочых і беспрацоўных аб правядзеньні *дня барацьбы з беспрацоўем—6 сакавіка.*

Барацьба павінна быць накірована супроць сацыял-фашыстых, якія стаяць за капіталістычную рацыяналізацыю, супроць капіталістычнай рацыяналізацыі, за 7-мі гадзінны рабочы дзень, за поўнае пасобіе ўсім беспрацоўным на ўвесь час беспрацоўя, за поўную зарплату рабочым і іншае.

Рух беспрацоўных зьвязаны з стачачнай барацьбой і са ўсімі гаспадарчымі і палітычнымі баямі рабочае клясы.

БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА і СЯЛЯНКА

№ 5—6 || ОРГАН АДДЗЕЛУ РАБОТНІЦ І СЯЛЯНАК ЦК КП(б)Б || Люты, 1930 г.

8 Сакавіка.

8-е сакавіка ў г. г. саўпадае з 20-цігодзьдзем, калі пралетаркі ўсяго сьвету парашылі арганізавана, сумесна з усім пралетарыятам, змагацца за сваё раўнапраўе, за пралетарскую рэвалюцыю.

З году ў год 8-е сакавіка зьяўляецца міжнародным абглядам рэвалюцыйных сіл пралетарак. З году ў год мацнее клясавая сьвядомасьць і пралетарская салідарнасьць працоўных жанчын усяго сьвету. З году ў год папаўняюцца рады камуністычных партый усіх краін перадавымі работніцамі.

Многа камуністак тамяцца ў турмах, шмат іх гінуць ад зьверскіх пытак капіталістычных катаў у турэмных сьценах, але-ж як бязьлітасна ні распраўляецца буржуазія з бальшавікамі і бальшавічкамі, рэвалюцыйная энэргія рабочае клясы не аслабявае, а, наадварот, яна расьце, мацнее і, замест замучаных у турмах, растуць новыя арміі бальшавікоў-рабочых у шэрагах камуністычнае партыі.

Гэтая рэвалюцыйная армія рабочых ідзе пад ваяўнічымі сьцягамі Камуністычнага Інтэрнацыяналу для рашучай барацьбы з капіталізмам ва ўсім сьвеце, за перамогу пралетарскай дыктатуры, за абарону СССР.

У СССР 8-е сакавіка будзе праходзіць на падставе вялізарнейшых посьпехаў соцыялістычнага будаўніцтва — шпаркага разьвіцьця прамысловасьці, асабліва мэталёвай, калгаснага будаўніцтва.

Наша сацыялістычнае будаўніцтва і рацыяналізацыя прамысловасьці накіраваны на падвышэньне матар'яльнага і культурнага ўзроўню працоўных мас. Шпаркае разьвіцьцё прамысловасьці і калектывізацыя таксама садзейнічае хутчэйшаму зьнішчэньню беспрацоўя.

У БССР у 1930 годзе, у аднэй толькі цэнзавой прамысловасьці, жаночая рабочая сіла складае больш 40 проц. усяе рабочае сілы ў прамысловасьці. Беларусь да 1931 году будзе ўся калектывізавана, гэта значыць, што батрацкія, бядняцкія і серадняцкія масы будуць разгортваць буйную калектыўную гаспадарку і на падставе суцэльнай калектывізацыі зьнішчаць кулацтва як клясу.

Пралетарская дзяржава пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі росьціць пралетарскія кваліфікаваныя кадры для прамысловасьці і сельскай гаспадаркі ў розных навучальных установах; працоўных жанчын толькі ў рабфаках, тэхнікумах і ВУЗ'ах вучыцца 5750.

Заветы Леніна аб уцягненьні працоўных жанчын у кіраўніцтва дзяржавай і гаспадарчым будаўніцтвам камуністычная партыя ажыцьцяўляе шляхам правадзімай палітыкі вылучэньня.

За 1929-30 гады вылучана працоўных жанчын гораду і вёскі ў саветы 9304, на гаспадарчую, каапэрацыйную работу 11330.

Прыведзеныя даныя далёка ня поўныя і дадзены не па ўсім галінам, яны гавораць аб тым, што пралетарыят, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, будуе сваю соцыялістычную гаспадарку і вядзе за сабой бядняцка-серадняцкія масы сялянства.

8-е сакавіка ў замежных краінах будзе праходзіць ў абстаноўцы капіталістычнай рацыяналізацыі, якая накіравана на масавае звальненьне рабочых, на скарачэньне заработнай платы, на павялічэньне рабочага дню.

У аднэй толькі Нямеччыне 4 мільёны беспрацоўных.

Ва ўсіх капіталістычных краінах зараз маецца каля 20 млн. беспрацоўных.

Капіталістычная прамысловасьць ва ўсім сьвеце расхістваецца, працоўныя масы гораду і вёскі жабрацтвуюць ад капіталістычнай эксплёатацыі і ад падатку на вайсковае ўзброеньне.

Рабочыя і сяляне Нямеччыны стогнуць пад цяжкасьцю выплаты вайсковай запазычанасьці міжнароднай буржуазіі, за імпэрыялістычную бойку 1914 г.

Міжнародная буржуазія шалёна рыхтуецца да новай бойкі, да захопу новых рынкаў і парабашчэньня працоўных.

У першую чаргу яна імкнецца зьнішчыць СССР. Разьвіцьцё прамысловасьці і калектывізацыі і правадзімая палітыка зьнішчэньня кулака як клясы вырывае апошнюю надзею ў міжнароднай буржуазіі ўзарваць краіну Саветаў знутры.

Вось чаму ў сучасны момант міжнародная буржуазія вядзе наглыя нападкі, хлусьню супроць СССР і шалёна рыхтуецца да ваеннага нападу на краіну Саветаў.

Працоўныя масы жанчын гораду і вёскі БССР у дзень сьвяткаваньня 8-га сакавіка павінны памятаць, што разьвіцьцё прамысловасьці, калгаснага будаўніцтва і бязьлітасная барацьба з кулацтвам і яго канчатковае зьнішчэньне як клясы, на падставе суцэльнай калектывізацыі зьяўляецца найпэўнейшым узмацненьнем абароны краіны.

Выкананьне прамфінпляну, пляну пасеўкампаніі, абагульненьне жывёлы і сродкаў вытворчасьці ў калгасах зьяўляецца лепшым залогам пасьпяховага соцыялістычнага будаўніцтва і перамогі ўсіх цяжкасьцяў.

8-е сакавіка павінна стаць для працоўных жанчын гораду і вёскі яшчэ большым штурхачом актыўнага іх удзелу ў вытворчым і грамадзкім жыцьці, у справе ліквідацыі няпісьменнасьці, падняцьця кваліфікацыі і шпарчэйшай перабудовы быту на калектыўных пачатках.

8-е сакавіка для работніц, батрачак і бяднячак-калгасьніц павінна стаць баявым ваклікам для ўступленьня ў шэрагі камуністычнай партыі, якая стаіць на чале соцыялістычнага будаўніцтва—ажыцьцяўляе заветы Леніна.

Журава.

ГПБ Ср. Аз.

Вы—змагары за волю мільёнаў прыгнечаных.

(Ліст з польскай турмы).

Палкае братэрскае прывітаньне нашым сёстрам—работніцам і сялянкам Польшчы, Заходняй Беларусі, якія пад сьцягам кампартыі змагаюцца з гнётам фашызму.

Дарагія мае таварышы! Ці разумееце вы, якая моц, якая пэўнасьць напаўняе нас, калі чытаем вашы лісты.

Нашы лятуценьні ператвараюцца ў вас у канкрэтныя пляны.

Пляны гэтыя, ажыцьцяўлёныя ў вас, робяцца ў тысячу разоў больш вялізнымі, чым у нашых лятуценьнях.

І вось з гэтаю ведай прыходзіць і думка: няхай нас, пакуль што, туг і катуюць, няхай і расстрэльваюць на дэманстрацыях, няхай мучаць у дыфэнзывах і мораць па астрогах!—але СССР існуе.



Войска падаўляюць оунт палітзьняволеных у амэрыканскай турме.

Але сацыялізм будуецца на зямлі.

А калі існуе СССР—будзе перамога і ў нас.

Вось гэтая вера ў перамогу, гэтая пэўнасьць у ёй—вельмі характэрнае зьявішча ў цяперашні час сярод шырокай гушчы рабочых і сялян.

Фашызм сваёй падвойнай палітыкай—і палкі і цукеркі выкоўвае на сваю пагібель такую гвардыю, што можаце быць упэўнены ў тым, што хутка працоўныя Польшчы будуць зьбірацца на свае зьезды Саветаў.

Вы ўжо гэта пэўна чулі ад нашых дэлегатаў, але прыслухайцеся, родныя, і вы пачуеце гэта таксама праз тысячы закратаваных вакенцаў, праз гул машын, праз магутны сьпеў дэманстрацый, праз асьцярожны шопат канспірацыйных пасяджэньняў.

Вы чуеце?

Ну, дык яшчэ хутчэй і мацней будуйце, крышэце, лаймайце рэшткі старога ладу, і ведайце, што ад кожнага ўдару вашых малаткоў уздрыгаецца ўся будыніна фашыстскай Польшчы, а мы вышэй узьнімаем галовы, мацней сьціскаем кулакі.

Ці памятаеце вы аб гэтым?

Памятайце, каханыя, і ганарыцеся тым, што вы ня толькі будаўнікі сваёй сацыялістычнай бацькаўшчыны, але і змагары за волю мільёнаў, мільёнаў, прыгнечаных фашызмам работнікаў і сялян.

Трэба, каб аб гэтым ведаў кожны „фабзайчык", кожная сяброўка калгасу.

Колькі сіл гэтым прыбавіцца, на колькі даражэйшай будзе праца.

Я атрымала і лісты з Польшчы.

Таварышы мае на волі жывуць ад турмы да турмы, а паміж аднэй і другой турмой некалькі вобыскаў, арыштаў, дазнаньне ў дыфэнзыве.

Мілыя таварышы камунаркі. Шлю вам гарачую, гарачую падзяку за ваш падарунак і за ліст.

Разам са мною дзякуюць усе мае таварышы, бо гэта была радасьць ня толькі для мяне.

Усе мы прымералі і фартушок і кохтачку: любаваліся, разглядалі работу і ў бязьмернай радасьці паўтаралі. „Як-жа нам ня быць моцнымі духам, калі аб нас думаюць нашы вольныя сёстры, калі праз межы і праз астрожныя муры працягваюць нам рукі".

Родныя, дарагія. Ведайце, што вы ўлілі ў нас цэлае мора сілы, што дапамаглі перанесьці ў будучым не адну яшчэ галадоўку, прасядзець не адзін яшчэ год у панурых сьцянах, пад зьдзекам, пад фашыстаўскім батагом.

З захапленьнем чыталі мы аб вашых супольных каровах, сьвіньнях, засеках жыта, пшаніцы.

Пыталіся адзін у аднаго: „Як-жа гэта выглядае 24 хунтавы качан? Напэўна ня зьмесьціцца на нашым стале".

З радасьцю прымаю ваша запрашэньне прыехаць да вас у госьці.

Але будзе такі час, калі мы будзем езьдзіць у госьці ня толькі з кардону ў Сьмілавічы, але будзем сябрамі аднэй вялікай камуны.

А пакуль што працуйце, родныя.

Яднайце вакол сябе як мага больш вёсак.

Дэманстрацыя беспрацоўных у Нямеччыне.

А мы за межамі СССР, ня гледзячы на расстрэлы і вастрогі, яднаем рабочых і сялян для змаганьня за волю, за Савецкую Польшчу, за Савецкую Заходнюю Беларусь.

Моцна цісну вашы рукі.

Пішэце аб сваім жыцьці.

Ваша В.

К КАМУНІЗМУ!

Сёньня адважна,
пад сьцягам чырвоным—
ў думках—сіла,
ў сэрцах—агні...
Мільёнаў работніц
крочаць калёны.
Уперад, к перамозе,
за комунізм!

З сырых падвалаў,
праз муры турмаў
ламаюць, крышаць
крывавы ўціск,
рвуць ланцугі
адважным штурмам...
К новым баям,
за комунізм!

Захад і ўсход
ўсё ярчэй палынее.
Зоркай гарыць
Савецкі Саюз.
АРМІЯ ПРАЦЫ
расьце, мацнее,
гартуе змагароў
за комунізм!

ВОСЬМАЕ САКАВІКА...
Паднявольных вочы
ў краіну САВЕТАЎ
неадрыўна ўпіліся.
Музыка молатаў кліча...
І ночы
сталі сьвятлей.
Уперад,
к комунізму!

Калгасьніца.

Музыка молатаў,
сталёвых валікаў
ў магутным разьбезе
ўперад імчыць.
Ударны цэх,
ударная фабрыка,
ударнай працай
куем комунізм!

Электрыкі сьвет
залівае далі.
Пяць год ператворым
ў чатыры гады.
Сусьветных пролетараў
будуем цытадэль.
Пераможна упрад,
за комунізм!

Работніца-майстар,
дырэктар, мэханік,
баец, токар, сьлесар,



Тав. Гольдштэйн пам. машыніста МББ чыгункі.

змагар, машыніст;
у савеце, над кнігаю,
ў калгасе, на фабрыцы,—
пад Ленінскім сьцягам
будуе комунізм.

Узрасьціла нас фабрыка.
Стаім на варце...
Пролетарка, батрачка,
ударніца-будаўнік,
у рады магутнай Ленінскай
партыі
ідзем будаваць
комунізм!

Рэшткі ворагаў
з шляху зьмятаем,
вёску ператворым
ў каляктыў вялізны.

Камсамолка—Узбэчка.

Горад кіруе,
вядзе, заклікае—
вёска выходзіць
на шлях комунізму.

Наш шлях пераможны.
Увесь сьвет ўжо агнідзе...
Свайго пахавальніка
росьціць фашызм.
Мы, волаты, скалы
прымусім схіліцца.
Нас кліча Ленін
ў баі,
к комунізму.

Захад і ўсход
адна мэта яднае.
Валадарства працы
будаваць
узяліся мы.
Мы пераможам,
мы ўпэўнена знаем:
мы пабудуем
сусьветны
комунізм!

Сёньня адважна,
пад сьцягам чырвоным...
У думках—сіла,
у сэрцах—агні.
Мільёнаў работніц
крочаць калёны—
Уперад, пераможна,
за комунізм!

Г. А.

НА АБАРОНУ КРАІНЫ.

Да 8 сакавіка арганізаваць працоўных жанчын для масавага ўступленьня ў Асо-авіахім.

Ня спыняючаяся падрыхтоўка імпэрыялістычных дзяржаў да новых боек і ў асаблівасьці ўзмацненьне варожасьці капіталістых да краіны саветаў, у выніку нашага пасьпяховага сацыялістычнага будаўніцтва і наступленьня на кулацтва—патрабуюць асаблівай пільнасьці ўсіх працоўных да справы абароны краіны.

Працоўная жанчына займае важнае месца ў справе абароны. Але, ня гледзячы на гэта, удзел іх у таварыстве Асо-авіахіму, практычная падрыхтоўка жанчын да абароны яшчэ адстае.

Калгасьніцы-стралкі.

Так, па Віцебскай і Аршанскай акругах жанчын у складзе Асо-авіахіму толькі каля 19 проц.,—гэта значыць, менш чым пятая частка ўсіх сябраў Асо-авіахіму.

Недастаткова ўцягнуты жанчыны і ў вайсковую вучобу; напрыклад, у трох акругах: Віцебскай, Полацкай і Аршанскай, у гурткох вайсковых ведаў навучаецца толькі 1164 жанчыны. А гэтага, вядома, мала.

Для большага ўцягненьня жанчын у работу Асо-авіахіма на месцах існуюць сэкцыі па рабоце сярод жанчын, але некаторыя сэкцыі яшчэ зусім не разгарнулі сваю работу.

Ва ўмовах Беларусі, якая зьяўляецца прымежнай часткай Савецкага Саюзу, патрабуецца асаблівая ўвага задачы падрыхтоўкі работніц, жонак рабочых і працоўных сялянак да справы абароны.

У гэтай рабоце патрэбен зрух, з боку ўсіх арганізацый Асо-авіахіму. Жаночы актыў, дэлегацкія сходы гораду, асабліва вёскі—павінны разгарнуць растлумачальную работу сярод работніц і жонак рабочых, батрачак, калгасьніц, бяднячак і сераднячак аб задачах абароны.

Неабходна растлумачыць кожнай працоўнай жанчыне аб шалёнай падрыхтоўцы капіталістых да вайны. Чым лепш мы будзем падрыхтаваны для таго, каб даць жорсткі адпор спробам напасьці на нашу пралетарскую дзяржаву, тым мацней будзе абаронена наша соцыялістычнае будаўніцтва.

Таму кожная працоўная жанчына павінна ведаць задачы, якія стаяць перад ёй у справе абароны. Яна павінна рыхтаваць сябе для таго, каб у нямінуемых бойках з капіталістымі, быць здольнай замяніць працу мужчын у вытворчасьці, у сельскай гаспадарцы, калі яны пойдуць у рады Чырвонай арміі.

Каб абараніць тыл Чырвонай арміі, фабрыкі, заводы, самую сябе—жанчына павінна аўладаць вінтоўкай. Але і ў шэрагах Чырвонай арміі вялікую карысьць можа даць работніца па нясеньню ўспамагацельнай службы: сувязі, палітасьветнай і адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце. Вялікая роля належыць жанчыне ў справе санітарнай дапамогі.

Да ўсяго гэтага работніцы і сялянкі павінны падрыхтаваць сябе. Гэтага яны дасягнуць, калі, уступаючы ў Асо-авіахім, яны будуць вучыцца ў хэмічных, вайскова-санітарных і іншых гуртках. **Арганізаваць масавае ўступленьне работніц, жонак рабочых, калгасьніц, сялянак у Асо-авіахім да 8 сакавіка—задача актыву.** Сувязь працоўных з Чырвонай арміяй, якая стаіць на варце нашай працы, трэба яшчэ больш замацаваць. Кожная работніца і жонка рабочага павінна актыўна ўдзельнічаць у шэфстве над Чырвонай арміяй.

Вараб'ёва.

Вывучаем вайсковыя веды.

Гурток вайсковых ведаў пры Наркамфіне выключна з жанчын. Зараз у ім 15 чалавек. Заняткі праводзяцца раз у пяцідзённку. Акрамя вывучэньня тэорыі, кожны раз праводзіцца стральба. Жанчыны ўжо добра страляюць, ведаюць вінтоўку, разборку і чыстку.

Зараз мы пастанавілі выклікаць на спаборніцтва каманду з 6 асоб з заводу „Энэргія", „Чырвоная Зорка" і Дзяржбанк.

Асо

2 гадзіны працы на абарону.

25 работніц і дэлегатак швэйнай фабрыкі „Прафінтэрн", пальтовага цэху,—адлічваюць 2 гадзіны працы ў карысьць Дальня-Ўсходняй Чырвонай арміі і выклікаюць пасьледваць прыкладу работніц і дэлегатак таго-ж цэху зьмены Катышова.

Арганізавалі ячэйку МОПР'у.

Дэлегаткі Быхава арганізавалі ячэйку МОПР'а і за адзін тыдзень завербавалі сто сяброў ячэйкі. Наладзілі спэктакль у карысьць МОПР'у—выручылі 59 руб.

Хайкіна Хая.

Дапамаглі практычна.

Работніцы трапічнага заводу „Чырвоны Тэкстыльшчык" правялі 6 васкрэсьнікаў на індустрыялізацыю краіны, дзе зарабілі 820 руб. 55 кап., з якіх—770 руб. 43 кап. пушчана на мэханізацыю заводу, а астатнія грошы здалі ў агульны фонд індустрыялізацыі краіны.

Коцік.

Калінкавічы, Мазырскай акр.

12-я ГАДАВІНА ЧЫРВОНАЙ АРМІІ І ЗАДАЧЫ АБАРОНЫ.

Дванаццатая гадавіна Чырвонай Арміі праходзіць у момант буйнейшых зрухаў як у міжнародных абставінах, гэтак і ўнутры нашай краіны.

У нас у краіне ўсе творчыя сілы, увесь энтузіазм мас накіраваны на ажыццяўленьне ў магчыма карацейшы тэрмін вялікага пляну сацыялістычнага будаўніцтва. Дзякуючы вялізарнай актыўнасьці рабочых мас, мы ўнесьлі буйныя зьмены ў наш пяцігадовы пляи разьвіцьця гаспадаркі ў бок павялічэньня вызначаных плянаў і скарачэньня тэрмінаў іх выкананьня.

Мы дабіліся вялізарнейшых посьпехаў у галіне індустрыялізацыі краіны, дзякуючы якім мы ўжо зараз маем магчымасьць пяцігодку выканаць у 4 гады.

Пасьпяховае ажыццяўленьне пляну індустрыялізацыі краіны стварыла моцную базу для сацыялістычнай перабудовы нашай вёскі на аснове каляктывізацыі.

І ў гэтай галіне мы дасягнулі значных посьпехаў, дабіліся ніколі нябачаных да гэтага тэмпаў сацыялістычнай перабудовы вёскі. Мы маем цяпер масавую цягу ў калгасы шырокіх пластоў бядняцкіх і серадняцкіх мас, мы ўжо маем шэраг акруг і вобласьцяй суцэльнай калектывізацыі.

У БССР мы ў два годы каляктывізуем усе бядняцка-серадняцкія гаспадаркі; на сёньнешні дзень у нас ужо маюцца 2 акругі суцэльнай калектывізацыі.

Хуткі тэмп індустрыялізацыі і сацыялістычная перабудова сельскай гаспадаркі паставілі перад намі задачу—ад абмежаваньня эксплёататарскіх тэндэнцый кулацтва перайсьці да палітыкі рашучай ліквідацыі кулацтва як клясы.

У гэты час, калі мы з такімі нябачнымі тэмпамі ідзём да сацыялізму, у капіталістычным сьвеце адбываецца вастрэйшы эканамічны крызіс. Пагоршваецца становішча рабочае клясы і працоўных мас, расьце беспрацоўе, нарастаюць усё новыя канфлікты паміж працай і капіталам. Рабочыя дэманстрацыі бязьлітасна расстрэльваюцца атрадамі жандараў, пры дапамозе войск і пры актыўным удзеле сацыял-фашыстых.

Эканамічны крызіс яшчэ больш узмацніў супярэчнасьці паміж асобнымі імпэрыялістычнымі дзяржавамі і групоўкамі, назраваюць новыя канфлікты за перадзел калёній, за новыя рынкі збыту. Буржуазныя дзяржавы прыкрываюцца словамі аб міры і гэтак званымі „канфэрэнцыямі па разбраеньню“ і ў той-жа час ліхаманкава рыхтуюцца да новых войн. Ім у гэтай справе старанна дапамагаюць сацыял-фашыстыя ўсіх колераў.

Але ў першую чаргу буржуазія рыхтуе новую вайну супроць СССР—бацькаўшчыны пралетарыяту усіх краін.

Імпэрыялістыя ня могуць раўнадушна глядзець, як пасьпяховы рост сацыялістычнага будаўніцтва ў нашай краіне, як суцэльная калектывізацыя і зьвязаная з ёю барацьба за ліквідацыю кулацтва як клясы, канчаткова зьнішчае апошніх унутраных саюзьнікаў сусьветнага капіталу ў нашай краіне.

Мэта капіталістых—выратаваць свае апошнія пазыцыі ў СССР, не дапусьціць выкананьня пяцігадовага пляну.

Шэраг правакацый, накіраваных супроць Савецкага Саюзу, пачынаючы ад канфлікту на Кітайска-Усходняй чыгунцы—спробы намацаць штыком нашу абароназдольнасьць, вобыскі ў нашых дыплёматычных прадстаўнікоў у Мэксыцы і Мюнхэне (Нямеччына), суд фальшываманэтчыкаў і іншае. Усё гэта накіравана да падрыхтоўкі к вайне супроць СССР.

Гэта абавязвае нас да вялізарнейшай пільнасьці ў пытаньнях абароны. У першую чаргу нам патрэбна яшчэ больш увагі ўзмацненьню абароназдольнасьці нашай Чырвонай арміі, яе баявой падрыхтоўкі, каб яна ў любы момант была гатовай даць адпор новым спробам нападу на Савецкі Саюз.

На варце.

Адначасова з гэтым Чырвоная армія зьяўляецца актыўнейшым удзельнікам сацыялістычнага будаўніцтва нашай краіны. Яна дала Савецкаму Саюзу, асабліва вёсцы, шмат савецкіх, партыйных, культурных і грамадзкіх працаўнікоў. З шэрагаў Чырвонай арміі вышлі дзесяткі тысяч застрэльшчыкаў сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі.

І ў гэтым годзе перад Чырвонай арміяй стаіць задача, не паслабляючы баявой падрыхтоўкі, падрыхтаваць статысячны атрад арганізатараў сацыялістычнага будаўніцтва вёскі.

Да XII гадавіны Чырвонай арміі трэба правесьці масавую праверку шэфства рабочых арганізацый над вайсковымі часткамі, масавыя паходы рабочых і работніц у казармы. Рабочым і работніцам трэба шырока пазнаёміць чырвонаармейцаў з ходам выкананьня прамфінпляну, соцыялістычным спаборніцтвам на прадпрыемствах і самім больш азнаёміцца з становішчам падшэфных частак, з іх баявым мінулым і распрацаваць мерапрыемствы па далейшаму ўзмацненьню шэфпрацы і сувязі паміж рабочымі масамі і чырвонаармейцамі.

Міжнародныя абставіны абавязваюць арганізацыі Асо-авіахіму ўзмацніць работу па ліквідацыі вайсковай няпісьменнасьці сярод працоўных, вярбоўку рабочых, работніц і бядняцка-серадняцкіх мас у Асо-авіахім.

Нашым адказам на антысавецкую кампанію з боку капіталістых і сацыял-фашыстых павінна быць яшчэ большае згуртаваньне рабочых і бядняцка-серадняцкіх мас вакол камуністычнай партыі, напружаная работа па ўзмацненьню баявой моцы Чырвонай арміі, па яшчэ большаму пасіленьню тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва.

Васькевіч.

Калгасьніцы на зьезьдзе.

(Акруговы зьезд калгасьнікаў).

Адзін за другім усходзяць на трыбуну дэлегаты. У ліку прамоўцаў мільгаюць жанчыны—калгасьніцы, камунаркі.

Аб чым гавораць яны? Зараз-жа абагуліць жывёлу, насеньне, сваячасова падрыхтаваць сельска-гаспадарчы інвэнтар.

Тыя, хто ўжо некалькі год у калгасе—дзеляцца вопытам, уносяць прапановы.

Патрэбна бальшая дапамога аграномамі. Неабходна лепш арганізаваць быт, наладзіць агульнае харчаваньне, ясьлі.

Калгасьніцы сталі больш актыўнымі ў гаспадарцы, вучацца кіраваць асобнымі галінамі яе, але вось толькі пакуль хатнія дробязі заядаюць: дзеці, печ.

— Арганізуем сталоўку, ясьлі—кожныя рабочыя рукі ад дробязяй разблытаюцца, у гаспадарцы карысьць дадуць—заяўляе т. Пшэбік Ліза.

Ліза—матка 3-х дзяцей, яна-ж і старшыня калгасу „Чырвоны Кастрычнік“, што ў Капыльскім раёне. Сама-ж Ліза—арганізатар гэтага калгасу.

Вось што апавядае яна пра гісторыю калгасу „Чырвоны Кастрычнік“.

— Увесь свой век я батрачыла ў кулакоў, бо з паўтары дзесяцінак, ніяк не пракорміш сям'ю.

Дэлегаткай была, сябрам сельсавету. З грамадзкай працай моцна пасябравала. А муж супроць: „сходы, ці я“, аднойчы рашуча заявіў мне муж.

Падумала я і так адказала мужу: „Ну што-ж, грамадзкай працы я ня кіну, бо ў гэтым усё ма" жыцьцё. А табе, калі няўгодна—разыйдзіся.

Узялі развод. Але не адышоў ад мяне муж, так і дагэтуль разьведзеныя жывём.

Цёмныя людзі былі ў першыя гады, ня тое, што зараз.

Трэба працу культурную павесьці—парашылі мы.

Нагаварылі адну сялянку—згадзілася абразы пазьнімаць. Чырвоны куток у гэтай хаце арганізавалі. Плякатамі ўпрыгожылі, грошы сабралі, газэты выпісалі. Зьбіраліся, чыталі.

А пасьля пра калгасы гутарыць пачалі. Многія ўпіраліся спачатку, усё кулакі наводзілі, запалохвалі. Я па хатах пашла да беднаты, сераднякоў. З свайго жыцьця неабходнасьць арганізавацца ў калгас даводзіла.

„Вось, на мяне паглядзіце,—казала я,—у каго толькі з кулакоў я ня была падзёншчыцай, у каго толькі я ня мыла падлогу, ваду не цягала. А ў калгасе працаваць

т. Пшэбік Ліза—старшыня калгасу.

таксама патрэбна, але праца спорная і любая, бо працуем гуртом не на ворага кулака.

Так паступова пераканаліся 25 гаспадарак. У 1928 годзе арганізаваўся калгас. Лізу абралі старшынёю яго. А муж Лізы супроць калгасу, не пашоў з ёю разам, разлучыўся.

Гэта ніяк не хістанула Лізу. Усе свае сілы і здольнасьці яна аддавала на замацаваньне новага каляктыву.

А сілы многа патрэбна было.

У лік прынятых у калгас зацясаўся і варожы элемэнт з мэтай разбурыць яго знутры.

У выніку кулацкай работы праз кароткі час у калгасе засталося толькі 7 сямей.

Застаўшыяся ўпарта змагаліся з клясавым ворагам, будавалі калгас, уплывалі на акаляючую беднату і серадняцтва.

А зараз яшчэ адна перамога на фронце сацыялістычнай перабудовы вёскі: да калгасу далучылася ўся вёска, у тым ліку і муж Лізы.

Ня прынялі толькі індывідуальна абкладзеных, ды тых, хто разбазарваў жывёлу.

Насеньне мы ўжо ўсе абагулілі. Зараз абагульваем жывёлу.

Калі абгаварылі пытаньне абагульваньня жывёлы, некаторыя новыя супярэчылі: „Пачакаем вясны“—гаварылі яны.

На гэта мы так адказалі: „Вы далучыліся да нас, дык далучайцеся і да нашых парадкаў. А мы назад ня пойдзем“.

Згадзіліся ўсе.

Наш калгас расьце.

А ўвясну—зусім расквітнее. Больш рук—дружней размах.



Дэлегаткі Менскага акруговага зьезду калгасьнікаў.

Камінскага з хутару нядаўна раскулачылі мы; забралі ад яго ў калгас: 6 кароў, 4 коняй, 6 авечак, 10 сьвіней, касарку, жняярку, сяўнік, грабалку, 4 спружыноўкі, 3 камплекты жалезных барон, 3 двухлямешных плугі, малатарню, сячкарню, „Арфу“, веялку, 8 вазоў, 5 саней і 12 хамутоў.

Усё гэта перайшло ў маёмасьць калгасу. Бо ўсё гэта нажыў кулак з нашага батрацка-бядняцкага мазаля.

Зараз некаторыя новыя жартуюць з мяне: „Калгас павялічыўся, хутка перавыбары. Ці застанешся ты старшынёю?“

А я на гэта адказваю, як думаю:

— Можа і ня буду я сябрам кіраўніцтва калгасу, але затое я ёсьць і буду сябрам калгасу.

* * *

Калгасьніцы—дэлегаткі зьезду патрабуюць большай увагі павышэньню кваліфікацыі калгасьніц. „З нашых радоў павінны каваццa спэцыялісты—кіраўнікі розных галін гаспадаркі“—заяўляюць яны.

* * *

А вось Хадасэвіч Марыля з Зембіну, Барысаўскага раёну ўжо мае 60 год за плячыма, матка 7 дзяцей, з якіх 1—камуніст, 4—камсамольцы, 1—піанэрка. Нядаўна і сама Марыля ўступіла ў партыю.

Хадасэвіч—актыўны агітатар за калгас. Па хатах хадзіла яна, і тлумачыла, каб адкідалі ад сябе кулацкія байкі, хлусьню на калгасы.

На кулацкую агітацыю—прадаваць жывёлу—Марыля заявіла: прэч кулацкае шкодніцтва. Мы ідзем будаваць каляктыў—і загадзя павінны клапаціцца, каб гаспадарка хутчэй расла, стала на ногі, і закрочыла ўперад, к сацыялізму.

Я зроду ня мела каровы, а зараз

т. Хадасэвіч

выпеставала яе ўласнымі рукамі з лёзунгамі выпраўлю яе ў калгас.

Зараз у Зембіне арганізаваўс калгас „Чырвоная Зьмена“, сябрам якога зьяўляецца тав. Хадасэвіч Марыля.

— Пагляджу я на сёньняшні дзень, падумаю як шпарка будуецца новае жыцьцё, як стройнымі калёнамі, пад кіраўніцтвам кампартыі крочаць працоўныя масы ўперад, і тады зусім забываю я свае шэсьцьдзесят год. Мне здаецца тады, што мне толькі 16 год.

Так многа сілы я адчуваю ў сабе для таго, каб разам з усім працоўнымі будаваць комунізм.

На хвіліну змоўкла сярэднягаловая Хадасэвіч Марыля, пасьля вочы яе загарэліся сапраўды юнацкім агенчыкам, і яна дадала.

— Я яшчэ буду працаваць, буду будаваць новае жыцьцё, бо ведаю, што справу будаўніцтва сусьветнай камуны будуць працягваць і скончаць мае дзеці—камсамольцы і піанэры і ўся падрастуючая чырвоная зьмена.

В. Хмялеўская.

Дэлегаткі калгасу „Іскра“ на экскурсіі.

Рапартуюць брыгадыркі.

Прыехаўшы для працы ў Дняпроўскую камуну, мы адразу заўважылі, што наша дапамога ў рабоце вельмі патрэбна.

За 10 дзён прабываньня ў камуне мы прыцягнулі к рабоце актывістак, якія абходзілі няпісьменных жанчын, праводзілі падпіску на часопісь „Работніца і Сялянка“—завербавалі 80 падпісчыц.

На нарадзе абгаварылі работу лікпункта.

Правялі працу па ўцягненьню лепшых, найболей актыўных калгасьніц у партыю. У выніку ў раёне 6 жанчын-калгасьніц падалі заяву аб уступленьні ў партыю.

Зараз савет камуны вылучыў 2 жанчын: адну, каб кіравала ў кароўні, другую—у сьвінарцы. 2 камунаркі пасланы на птушкаводныя курсы ў Менск.

Кепска з аплатай жаночай працы. Нават і тады, калі жанчына выконвае аднолькавую працу з мужчынай, яна атрымоўвае зарплату ніжэйшую. Мы на савеце камуны паставілі гэта пытаньне, растлумачылі, што выконваючыя аднолькавую працу, павінны мець аднолькавы заработак.

Савет камуны да гэтага часу ня цікавіўся работай ясьляў. На працягу трох тыдняў ляжала груда мануфактуры для зімовай вопраткі дзецям. Дзеці хадзілі ў хатняй вопратцы, а вопратка ляжала і ня шылася. Сход камунарак вынес пастанову арганізаваць васкрэсьнік для пашыўкі вопраткі. Назаўтра-ж у дзень рэлігійнага сьвята (храшчэньне) у клюб былі зьвезены машыны, маючыяся ў камунарак. Васкрэсьнік працягваўся тры дні. Зараз усе дзеці адзетыя ў новую вопратку.

Абгаварылі недахопы, маючыяся ў ясьлях, пастанавілі ўвесьці штодзенныя дзяжурствы мацярок абралі камітэт.

Яшчэ мы заўважылі, што жанчыны сябры сельсаветаў мала ўцягваюцца ў работу. Па Старадубскаму сельсавету яны зусім не прыцягваюцца да работы, нават не заўсёды запрашаюцца на пасяджэньні. Бытавыя камісіі пры сельсаветах ня складзены, а таксама яна зусім не працуе пры РВК

Брыгада работніц

Усе на барацьбу са стратамі ў вытворчасьці.

Да рабочых, работніц і ўсіх працоўных БССР.

Нашы выключныя посьпехі на фронце гаспадарчага будаўніцтва, вялізарны творчы энтузіязм мас, які выяўляецца ў новых, камуністычных формах адносін да працы (сацыялістычнае спаборніцтва, ударныя брыгады, бесьперапынная праца) паскараюць тэмп індустрыялізацыі краіны і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Далейшае ўзмацненьне дасягнутых посьпехаў па шляху выкананьня вялікіх работ пяцігодкі ў болей скарочаны тэрмін—у чатыры—тры гады, патрабуе вялізарнага напружаньня сіл, поўнай мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў і самага строгага рэжыму эканоміі ва ўсіх галінах вытворчасьці і

Сакратар ЦК КП(б)Б т. Гей гутарыць з Сормаўскімі рабочымі.

кіраўніцтва. Вось чаму перад намі ва ўсёй вастраце стаіць задача барацьбы са стратамі ў нашай гаспадарцы, барацьбы з няпоўным скарыстаньнем магчымасьцяй паскарэньня тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва.

Нерацыянальнае скарыстоўваньне сыр цу, матэрыялаў, машын, рабочага часу, прастоі на прадпрыемствах, ужываньне ў вытворчасьці дарагіх і дэфіцытных матарыялаў, там дзе, яны могуць быць заменены больш таннымі і недэфіцытнымі—у выніку ўсяго гэтага мы маем мільённыя страты.

Таксама ўтвараюцца вялікія страты ад нескарыстанага браку, адходаў, адкідаў, нерацыянальнага скарыстоўваньня электраэнэргіі, апалу, няправільнай арганізацыі працы. Напрыклад, ёсьць выпадкі, калі пры апрацоўцы драўніны ў фабрыках, пачынаючы ад лесасекі, траціцца на адходах каля 85 проц. драўлянай масы; у абутковай прамысловасьці траціцца на адходах ад 20 да 30 проц. скуранога тавару, адходы мэталяў, асаблівa па чыгуначных майстэрнях, дасягаюць 80—85 проц., вялікія страты ад нерацыянальнага скарыстоўваньня апалу ў прамысловасьці і г. д.

У гандлі мы трацім ад няўмелага, нядбайнага хаваньня і перавозак тавараў, недастатковай барацьбы з чаргамі, трацім шмат сродкаў на тару, з якой 45 проц. зусім зьнішчаецца. Шмат таксама прападае прадметаў другараднага экспарту, дамовых адкідаў, на што яшчэ можна купіць дадатковую колькасьць трактараў і машын.

Шмат сіл і сродкаў мы трацім у сельскай гаспадарцы ад няпоўнага скарыстоўваньня глебавых багацьцяў, рабочай жывёлы, машын, недастатковай барацьбы са шкоднікамі, з пажарамі.

Эканомія ад зьнішчэньня ўсіх страт можа даць вялізарныя сродкі для будаўніцтва новых фабрык, заводаў, для набыцьця трактараў, для будаўніцтва жыліш, школ і г. д.

Цэнтральны Камітэт Камуністычнай Партыі (бальшавікоў) Беларусі, Савет Народных Камісараў і Цэнтральны Савет Прафэсыянальных Саюзаў БССР зьвяртаюцца да рабочых, работніц і ўсіх працоўных Беларусі з заклікам шырока і практычна разгарнуць барацьбу са стратамі, увязваючы гэтую працу з разгортваньнем рацыяналізатарскіх работ, сацыялістычным спаборніцтвам, дапамагаючы рабочаму вынаходніцтву.

Задача прафэсыянальных союзаў, фабзавмясцкомаў, вытворчых нарад, непасрэдна арганізаваць рабочых ва ўдарныя брыгады для барацьбы са стратамі ў цэху, прадпрыемстве, калгасе, саўгасе, краме, установе, для чаго ўнядрыць у гэту справу сацыялістычнае спаборніцтва, практыкаваць арганізацыю тыдняў, дзесяцідневак і месячнікаў па барацьбе са стратамі і ператварыць гэтыя ўдарныя заданьні ў сыстэматычную барацьбу са стратамі.

Перад камсамолам стаіць задача арганізацыі ў гэтай барацьбе ўсёй працоўнай моладзі.

Спэцыялісты павінны ўзяць на сябе распрацоўку і вывучэньне пытаньняў барацьбы са стратамі і аказаць тэхнічную дапамогу рабочым і бядняцка-серадняцкім масам сялянства ў гэтай барацьбе.

Кіраўнікі прадпрыемстваў і ўстаноў павінны мабілізаваць сілы і ўвагу адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу і ўсяго апарату на дапамогу пралетарскай грамадзкасьці ў гэтай справе:

Рашучая барацьба са стратамі забясьпечыць нам больш кароткія тэрміны выкананьня пяцігодкі.

Усе на барацьбу са стратамі.

Сакратар ЦК КП(б)Б ГЕЙ.
Старшыня СНК БССР
М. ГАЛАДЗЕД.
Старшыня ЦСПСБ РЫЖОУ.

Рашучая барацьба са стратамі ў вытворчасьці і сельскай гаспадарцы—забясьпечыць выкананьне пяцігодкі. Работніцы, калгасьніцы і ўсе працоўныя жанчыны—на барацьбу са стратамі!

Рашаючая дзесяцідзённёўка.

Вынікі першай квадры новага гаспадарчага году на галянтарэйнай ф-цы „Беларуска“ не зьявіліся зусім нечаканымі ня толькі для адміністрацыі, але нават для большай часткі рабочых. Рабочыя і работніцы адчувалі такі правал, падлічваючы працу кожнага дню, адчувалі ў кожным сваім руху за варштатам.

У выніку толькі 49,4 проц. выкананьня прамфінпляну.

Трывожная, недапусьцімая лічба.

У чым справа? Дзе прычына?

Фабрыка існуе толькі другі год. Пераважная большасьць рабочых стала да варштату першы раз. Яны прышлі на фабрыку з мястэчка, вёскі, біржы. Упяршыню ім прышлося прывыкаць ня толькі к працэсу работы, але наогул к станку, к вытворчай дысцыпліне.

У стаўшых к станку раней рукі больш сьмелымі робяцца.

Але штодня сьцены фабрыкі ўбіраюць усё новых і новых. З працуючых сёньня 340 чалавек—60 уліліся за апошнія пару месяцаў.

Новых адразу адрозьніш.

Вунь, каля варштату сёньня новая стала. Марудней і марудней калываюцца яе рукі, пасьля зусім замiраюць. Дзяўчына прысела на скрынку.

— У чым справа? Чаму не працуеш?

—Мне ногі стаміліся,—пачуўся адказ.

Зьверху: ударніцы упаковачнага цэху Чырв. Бярэзіны.
Унізе—унутраны выгляд цэху.

А варштат нестамімы, ён не чакае. Не чакае і час, прамфінплян фабрыкі, напружанай працы патрабуюць інтарэсы пралетарскай дзяржавы.

Самавольны перапынак—не адзінічны на фабрыцы. К варштату трэба ня толькі прывыкнуць, але парадніца з ім, зразумець клясавы абавязак.

Асноўная маса рабочых адчувала, што з выкананьнем прамфінпляну — кепска, якасьць прадукцыі ўніз пакацілася. Рабочыя і работніцы заняліся гэтым пытаньнем.

Але на фабрыцы ў той час быў спэцыялісты з Нямеччыны. На прапановы рабочых на вытворчай нарадзе ён заявіў: „Досыць таго, што я падначалены адміністрацыі. Слухаць усіх рабочых я ня зьбіраюся“.

А вынікі кожнага дню настойліва патрабавалі таго, каб за палепшаньне працы ўзяўся кожны рабочы і работніца, каб кожная хвіліна, кожны рух быў падпарадкаваны мэце выкананьня прамфінпляну.

З „спэцам“, не жадаючым слухаць прапаноў рабочых—разьвіталіся.

Вынікі першай квадры ўзварухнулі рабочых.

Самым рашучым пераломам зьявіўся Ленінскі заклік ударнікаў.

Грабённы цэх і правільня цалкам абвясьцілі сябе ўдарнымі. Падналеглі на працу, ударылі па прагулам. Наладзілі дакладны падлік працы кожнага дню, цэху, аддзяленьня, рабочага.

І вось вынік: **дзесяцідзённёўка 2-й квадры дала 96,7 проц. выкананьня пляну. А ўдарны грабённы цэх выканаў 111 процантаў пляну.**

Ударніцтва даказала, што прамфінплян фабрыкі зусім рэальны. Ён можа быць выкананы, будзе выкананы праз сацспаборніцтва, ударніцтва, пры актыўным удзеле ўсіх рабочых і работніц.

Зараз на „Беларусцы“ яшчэ многа працы і над перавыхаваньнем новых рабочых і над выкоўваньнем у іх клясавай сьвядомасьці.

Скачок апошняе дзесяцідзённёўкі—лепшы доказ таго, што рабочыя „Беларускі“ разам з усім пралетарыятам здольны перамагаць у сацыялістычным будаўніцтве.

Але на фабрыцы яшчэ ёсьць і прагульшчыкі. Па іх з усёю рашучасьцю б'е грамадзкасьць.

Вось і зараз лупатая чорная дошка крычыць:

„Ці патрэбны нам такія? Шварцман і Сельдзін спазьніліся на работу на 30 хвілін.

Вось хто зрывае нам прамфінплян“.

Так. Правільна. Прагульшчыкі і лодыры зрываюць выкананьне прамфінпляну. Уся маса рабочых павінна рашуча змагацца з імі.

* * *

З агульнага ліку 340, на „Беларусцы“ большасьць—работніцы.

Работніцы шчотачнай ф—кі ўступілі ў партыю.

Ёсьць новыя, цікавыя пачыны дэлегатак. Чатыры дэлегаткі: Караваева, Рычагова, Занеўская і Вішнеўская перайшлі на „камуну“: заработак, атрымоўваючы на групу, будуць дзяліць па-роўнаму, у незалежнасьці ад выробу і кваліфікацыі.

Яны выклікалі пасьледаваць прыкладу яшчэ 3 цэхі, павысілі норму выпрацоўкі з 11 на 13 грос у дзень.

Зараз на фабрыцы створана яшчэ адна камуна і яшчэ некаторыя групы рабочых мяркуюць перайсьці на „камуну“.

Фабрыка ўступіла ў сацыялістычнае спаборніцтва з Ленінградзкім Охцінскім хэмзаводам, з якога атрымоўвае сыравіну.

Уцягваючы ва ўдарніцтва ўсю масу рабочых і работніц, рашуча змагаючыся з падрыўшчыкамі працы, „Беларуска“ павінна сацдагавор выканаць.

В.

Менск.

Бранявік „Анна-Марыя“*).

Апавяданьне К. Грунберга.

Цэлую ноч, то набліжаючыся, то ўдаляючыся, грымелі стрэлы і толькі к раніцы Лотта Грэнэр змагла нарэшце забыцца трывожным сном.

Нешта надзвычайнае яна ўбачыла перад вачыма, калі а 9-й гадзіне раніцы яна выйшла на разьведку.

Абсаджаная дрэвамі вуліца была пустая і здавалася вымершай. Малочная і мясная на працілежным баку вуліцы замкнены, і вітрыны іх наглуха зачынены вакеніцамі, як у нядзельныя дні. Але з усіх дзьвярэй высоўваліся людзі, зьбітыя ў надзвычайныя, сьмешныя гурты, напамінаючыя вінаградныя грозьдзі, усе яны глядзелі ў адным напрамку, імкнучыся ўбачыць тое, чаго яшчэ ня відаць.

— Носке ідзе! Носке ідзе!— Сьмяючыся выклікаў некі жэўжык, скачучы на аднэй ножцы, пад прыкрыцьцем глухіх кустоў садочка.

Вулічная таўхатня прыносіла яму мабыць вялізарнае здавальненьне. Дарослыя не падзялялі яго вясельля. Асабліва жанчыны, якія стаялі каля сваіх дзьвярэй з парожнімі кашолкамі і жбанкамі для малака: дзеці прасілі есьці.

Больш іншых хвалявалася сівая газэтчыца. У дваццаты раз пачынала яна апавядаць аб тым, што здарылася з ёю гадзіну таму назад, на бліжэйшым рагу:

— Іду сабе, ні аб чым ня думаю, з сваёю газэтнаю торбачкаю... Неспадзявана крычаць: „Аслабанеце вуліцу“. Адкуль не вазьміся 6 альбо 8 хлапцоў з стрэльбамі, і трашчоткаю... І ну паліць, куды папала. Побач са мною бегла жанчына, з такім вось маленькім на руках... Ніколі не забуду, як крычаў гаротны: „Мама, мама...“.

Мужчыны вялі сябе больш стрымана, але пасумеўшыя вочы і сьціснутыя ў кішэнях кулакі былі дастаткова выразнымі.

„Рабіць няма чаго“, падумала Лотта Грэнэр і, не сьпяшаючыся, зьвярнулася ў сваю ўдавіную каморку, якая знаходзілася ў адным з самых задніх карпусоў вялікага дому. І праводзячы праз швэйную машыну грубае, салдацкае палатно, яна цяжка ўздыхала; калі-ж спыніцца гэта бойка? Мір заключаны, а сьмерць яшчэ не насыцілася; яна кінулася цяпер углыб краіны... Значыцца, і гэта яшчэ-б давялося перажыць яе Альфрэду.

Сьлёзы адалелі яе, як і заўсёды, калі яна ўспамінала аб ім. Ні з кім ніколі ня было ў яе такой блізкасьці, як з ім,—першага мужа яна згубіла ў самым пачатку вайны. Тады яна паклялася сабе, што другі раз замуж ня пойдзе, каб зноў не перажываць трывогу і жах за жыцьцё блізкага чалавека, адарванага ад сям'і і кінутага ў акопы. Але абставіны і 22-х летняя кроў узялі сваё.

Аднойчы сустрэлася яна на вагзале з адным параненым. Яна пазнаёмілася з Альфрэдам Клерынгам і, ня гледзячы на свае зарокі і яго зусім ня выдатны выгляд,— пакахала яго.

Але як ні падобен быў новы шлюб на яе адносіны з першым мужам, да якога яе прывязваў толькі здаровы запал. З Альфрэдам Клерынгам яна ўпяршыню зразумела, да якой ступені пустое і безьзьмястовае было яе жыцьцё ў час кароткага першага замуства.

Разам з Альфрэдам яны чыталі кнігі, але яскравей усяго засталіся ў памяці іх бясконцыя гутаркі аба ўсім, што ёсьць цікавага ў жыцьці. Больш за ўсё гутарылі яны, вразумела, аб вайне, якую ён ня толькі ненавідзеў, але з якою, як упэўнены рэвалюцыянэр,—лічыў неабходным змагацца.

Гэта былі дзіўныя тыдні, расчыніўшыя перад ёю цэлы новы сьвет, аб існаваньні якога яна і не ўяўляла раней,— сьвет сьвядомага жыцьця, поўны самых жыцьцёвых задач. І пры гэтым сапраўднае каханьне, сапраўднае шчасьце

Але ўсё гэта было занадта прыгожым, каб працягвацца доўга. Вайна зноў заўладала апалчэнцам—Клерынгам. Хутка ён згінуў у час аднэй атакі. І Лотта Грэнэр зноў стала ўдавою. Слабая надзея на тое, што муж, можа быць, узяты ў палон і вернецца,—паступова памерла за 2 горкіх гады трывог і чаканьняў.

Лотта шкрыгнула зубамі і шпарка закруціла машынку. Ну, вось: зараз яшчэ вочы сьлепнуць ад сьлёз, усё шытво перакасілася, немагчыма працаваць... у Лотты закруцілася ў галаве, і яна адчула, што галодная да дурнаты.

Няўжо вуліца да гэтай пары не аслабанілася? Яна хутка загарнулася ў шаль, і зьняла торбачку з крука.

Але што гэта адбываецца на вуліцы? Каля самага дому працуюць некалькі мужчын: з таўстымі дубцамі вырванымі з жалезнай рашоткі выламваюць яны квадратовыя каменныя пліты з маставой; падвойны ланцуг мужчынскіх і жаночых рук перакідалі гэтыя пліты на дальні канец вуліцы, дзе будуецца барыкада.

Што гэта? Грамадзянская вайна, тая самая вайна, аб неабходнасьці якой як часта і так упэўнена гаварыў Альфэрд. Але не пасьпела яшчэ Лотта Грэнэр як сьлед зразумець

Сход бастуючых рабочых Францыі.

*) *Надрукованае апавяданьне „АННА—МАРЫЯ“ адносіцца да пэрыяду рэвалюцыі ў Нямеччыне ў 1918 годзе.*

Рабочыя тады пацярпелі паражэньне і ўладу з дапамогаю зрадніцкай сацыял-дэмакратычнай партыі,—захапіла буржуазія.

Упамінаемы ў апавяданьні Носке—сацыял-дэмакрат, які камандаваў белагвардзейскай арміяй, падаўляўшай паўстаньне рабочых. Ён асабліва ненавісны рабочым, за тыя расстрэлы, якія былі ў час рэвалюцыі.

Спартакаўцы—гэта перадавая, рэвалюцыйная частка рабочай незалежнай партыі Нямеччыны, якая адкалолася і пасьля палажыла аснаваньне Камуністычнай партыі Нямеччыны.

усё адбываючаеся, як на вуліцы паказалася некалькі людзей. З вінтоўкамі ў руках, у паўразадранай вопратцы беглі яны і яшчэ здалёк крычалі:

— Ратуйцеся! Ратуйцеся! Бранявы аўтамабіль!

І вось з грыматам выкацілася на вуліцу няўдалая карычневая цудовіна.

На вежы пагражаюча бліснула на момант імя цудовіны: „Анна-Марыя“,—і сьвінцовы град затрахацеў па вокнам і садам дамоў.

Зноў вымерла вуліца. Выглянуўшы за браму, Лотта бачыла, як забраніраваны гігант уламіўся ў барыкаду і, часткова разбурыўшы яе, загрымаў далей.

— Праклянъце! З бранявіком бяз пушак ня зладзіш,—вылаяўся, радам з Лоттай, некі ўзброены спартакавец.

Нечакана ёй успамянулася адно з вайсковых апавяданьняў Альфрэда: аб тым, як яго частка злавіла, аднойчы, бранявы аўтамабіль.

— Рубайце дрэвы! валіце іх поперак вуліцы,—праз іх гэта скрынка не пераскочыць!

Ці крыкнула яна гэтыя словы? Яна не памятуе. Але мужчыны адразу схапіліся за пілы і сякеры. Пяці хвілін не прайшло, як першы галінасты волат рухнуў поперак вуліцы.

Бранявік каціўся назад. Наткнуўшыся на нечаканую перашкоду, ён спачатку адскочыў назад, пасьля разьбегшыся зноў, з усяе сілы, рвануўся ўперад. Папярэднія шыны лёгка пераскочылі праз загародку. Але левае задняе кола злосна загуло ў пустаце, зьдзіраючы кару з старога каменна-цьвёрдага дрэва. Бранявік завяз.

— Ура! зараз мы яму прастрэлім глядзелкі,—радасна крыкнуў спартакавец, у шынэлі і лямцавым капялюшы,—і даў першы стрэл.

Кулі засьвісталі адсюль, звонка ляскаючы ў стальны бок „Анны-Марыі“. Яна не адмаўляла. Але з верхняга люку паказалася белая хустка.

— Спыніць стральбу! Але асьцярожна—гэта магчыма толькі хітрыкі,—крыкнуў начальнік—спартакавец, і, зьвярнуўшыся к бранявіку, дадаў:

— Выходзьце наружу, нічога з вамі ня будзе, Але шаваліцеся, бо не здабраваць вам усім,

Пакутная паўза... Пасьля рашчыніліся заднія сталёвыя дзьверы і, з выхаду хістаючыся выбраліся двое, з тварамі шэра-зялёнымі, як колер іх вопраткі. Трэці, з прастрэленым ілбом, застаўся сядзець за рулём.

Бранявы аўтамабіль „Анна-Марыя“ перайшоў у рукі спартакаўцаў.

Дрыжучы з страшэнным воблікам забітага перад вачыма дабралася Лотта Грэнэр да свае каморкі і кінулася на ложак. Бездапаможна азіраючыся, яна спыніла вочы на зьнімку Альфрэда Клерынга, абвітага амаль завялымі кветкамі...

Але што гэта? Твар памершага здаўся ёй больш жывым, як звычайна.

Адразу, нібы электрычны ток, яе пранізала думка... Гэта ён дапамог спартакаўцам захапіць сьмертаносны бранявік: яна толькі паўсьвядома выкрыкнула яго словы. Перастаўшы жыць, яе муж быў побач з ёю, змагаўся плячом к плячу ў іх агульных радох.

Жудасны вобраз белага ахвіцэра адразу затуманіўся... З якою зьнявагаю і гораччу гаварыў Альфрэд аб гэтых людзях.

Лотта Грэнэр ускочыла. Яна рашылася. Яна зразумела сваю задачу. Ён, Альфрэд, выбыў з радоў; ёй ня варта было дарэмна сумаваць аб ім. Яго думкі клікалі яе ў рады змагароў. І, поўная рашучасьці, яна зноў выйшла на вуліцу.

Тав. Ланцуцкі—польскі камуніст, гутарыць з піянэрамі Менску

8 сакавіка яшчэ цясьней згуртуем свае шэрагі вакол Ленінскай Бальшавіцкай партыі. За выразнае правядзеньне генэральнай лініі партыі!

8 сакавіка перадавых работніц-ударніц сацыялістычнай будоўлі—батрачак і бяднячак—змагароў за калектывізацыю—у рады камуністычнай партыі.

Калектывізуем Бе



Зьверху—калгасьнікі разглядаюць плян калгасу;
справа—абагульваюць коняй.

8 сакавіка мабілізуем нашы сілы няцка-серадняцкіх гаспадарак. Цясь рачак, калгасьніц, працоўных сялянак цыі **і ліквідацыі кулацтва як кляс**

Кулак—зьлейшы вораг нашага сац змагацца за раскулачваньне кулака радачы яго сродкаў вытворчасьці ка плянаў пасеўнай кампаніі. Дэлегаткі, нізуйцеся для актыўнага ўдзелу ў насеньня і стварэньня насенных фон абагульваньня жывёлы і сродкаў ў калгасы бядняцка-серадняцкіх га вытворчасьці.

Дамо рашучы адпор джае нашаму сацыяліст

Узьнімем культурны білізуем актыўнасьць ка поўнага зьнішчэньня ня рабудовы быту ў калгас

Работніца, будзь акт цыялістычнай перабудов

„Цяпер мы маем ма наступленьне супроць ціўленьне, ліквідаваць вытворчасьць вытворчасьцю калга праводзіцца самімі бядняцка-серад суцэльную калектывізацыю. Цяпер калектывізацыі ня ёсьць ужо прост кулачваньне зьяўляецца сустаўно калгасаў“.



Зьверху—ачыстка насеньня;
справа—разводзяць птушак;
сярэдні ўнізе—робяць агульны хлеў для жывёлы;
3-ці справа—малочная гаспадарка.

...парусь у два гады.

...суцэльную калектывізацыю ўсіх бяд-
...згуртуем вакол партыі работніц, бат-
...ажыццяўленьня задачы калектывіза-

...істычнага будаўніцтва; будзем актыўна
...ёнах суцэльнай калектывізацыі і пе-
...ам. Даб'емся пасьпяховага выкананьня
...лгасьніцы, бяднячкі і сераднячкі, арга-
...оце па хутчэйшаму абагульваньню
... у калгасах. Дабівайцеся хутчэйшага
...творчасьці ў калгасах і ўступленьня
...дарак з усёй маемасьцю і сродкамі

...ясаваму ворагу, які перашка-
...аму будаўніцтву.
...овень працоўных жанчын, ма-
...ьніц і працоўных сялянак для
...меннасьці ў калгасах, для пе-
... стварэньня дзіцячых устаноў.
...ым удзельнікам у справе са-
...ельскай гаспадаркі.

...ымасьць павесьці рашучае
...лацтва, зламаць яго супра-
...го як клясу і замяніць яго
... і савгасаў. Цяпер раскулачваньне
...кімі масамі, якія ажыццяўляюць
...скулачваньне ў раёнах суцэльнае
... адміністрацыйная мера. Цяпер рас-
...часткай утварэньня і разьвіцьця
Сталін.

Зьверху — сход калгасьнікаў;
зьлева — у хаце-чытальні слухаюць радыё;
зьнізу — агульныя каровы.

Калгас імя Энгельса, Гомельскай акр.

Фото-нарыс Грына.

Вучобу і вылучэньне працоўных жанчын—на цьвёрдыя рэйкі.

Рашэньне партыі аб вылучэньні работніц, батрачак і працоўных сялянак на кіруючую работу знайшло неабходнае праламленьне ў рабоце партыйных, савецкіх і прафэсыйных арганізацій. За апошнія паўтары-два гады мы маем, бязумоўна, зрух у справе рашучага вылучэньня працоўных жанчын на кіруючую работу.

Калі яшчэ нядаўна жанчына на кіруючай рабоце была рэдкім зьявішчам, то зараз мы сустракаем вылучэнак амаль ва ўсіх галінах.

Работніца—дырэктар заводу, майстар, мэханік; батрачка—кіраўнік савгасу, старшыня сельсавету, бяднячка—арганізатар калгасу, трактарыст—яны актыўныя ўдзельнікі нашага будаўніцтва.

Мы маем ужо 123 батрачкі, бяднячкі і сераднячкі старшынямі местачковых і сельскіх саветаў. Тры работніцы ў мінулым годзе вылучаны старшынямі Гарсавету, старшынь Райвыканкомаў, мы маем трох жанчын. Многа батрачак і бяднячак вылучана ў КСУ працуе на актыўнай рабоце.

На шэрагу буйных прадпрыемств: фабр. „Дзьвіна“, Акуляровая фабрыка, Панчошная фабрыка—

На курсах шофэраў.

у Віцебску, „Прагрэс“—у Менску, „Везувій“—у Гомелі, у якасьці памоцнікаў дырэктараў працуюць работніцы.

Дзякуючы дапамозе партыйных арганізацый, гэтыя вылучэнкі ў большасьці хутка растуць на працы. Куюцца жаночыя пралетарскія кадры ў прамысловасьці і сельскай гаспадарцы.

Але яшчэ шмат чаго трэба зрабіць. Мы наглядаем у радзе мейсц факты, калі ячэйкі і ўстановы нерашуча падыходзяць да вылучэньня, не даверяюць здольнасьці работніцы—вылучэнкі; мы маем выпадкі, калі вылучэньне праводзіцца выпадкова, без папярэдняга вывучэньня кандыдатуры,—для „справаздачы“

Работніца фабрыкі „Прафінтэрн“ т. Яуно—сябра Вярхоўнага суду

А фактаў, калі вылучэнцы не аказваюць належнай дапамогі, мы таксама маем нямала.

Хіба не відавочная праява бяздушных, фармальных адносін да вылучэнкі, калі работніцы ад варштату, толькі абранай у Гарсавет, даюць заданьне распрацаваць гадавы вытворчы плян, не паказаўшы, як гэта зрабіць. Такі факт мы мелі ў Шклове.

А вось што піша ў рэдакцыю другая вылучэнка, работніца фабрыкі „Везувій“ з 23-х гадовым вытворчым стажам:

Работа для мяне незнаёмая. Па агульнай адукацыі я малапісьменна, а дапамогі ад кіраўнікоў няма. Кожны заняты сваей працай. А калі просіш дапамогі, часам чуеш такі адказ: „За вас працаваць ня будзем, трэба самой разумець“.

8 сакавіка мы падводзім вынікі нашых дасягненьняў, але штодзённа трэба сачыць за тым, як выконваюцца рашэньні партыі аб вылучэньні, каб сапраўдна праводзіць іх у жыцьцё.

Партыйныя ячэйкі, дэлегацкія сходы павінны трымаць шчыльную сувязь з вылучэнкамі, каб забясьпечыць добрыя абставіны у іх рабоце.

Пачатая Савецкай уладай справа можа быць дзьвінута ўперад толькі тады, калі, замест соцен жанчын па ўсёй Расіі, у ёй прымуць удзел мільёны і мільёны жанчын, тады справа сацыялістычнай будоўлі, мы ўпэўнены, будзе замацавана.

Тады працоўныя дакажуць, што яны могуць жыць і могуць гаспадарнічаць—без абшарнікаў і капіталістых. Тады сацыялістычнае будаўніцтва будзе стаяць у Расіі так прочна, што ніякія ўнешнія ворагі ў другіх краінах і ўнутры Расіі ня будуць Савецкай рэспублікі страшны.

Ленін.

Падрыхтоўка новых кіруючых кадраў з работніц, батрачак, калгасьніц—зьяўляецца важнейшай нашай задачай. Але гэта цесна зьвязана з вучобай работніц і з падняцьцем яе культурнага ўзроўню і пісьменнасьці.

За апошні час пасылка жанчын у вышэйшыя і сярэднія навучальныя ўстановы павялічылася; так: у рабфакі Беларусі ў гэтым годзе прынята 116 жанчын, гэта значыць 27%, у Вузы—230, гэта значыць 26,9% і ў тэхнікумы—1096 жанчын.

Але шпаркія тэмпы нашага жыцьця, бурны рост нашай сацыялістычнай гаспадаркі—патрабуюць значна большай падрыхтоўкі пралетарскіх спэцыялістых.

Шкодніцтва з боку цэлага рада старых спэцыялістых, якія імкнуліся разбурыць нашу сацыялістычную будоўлю, што было ўскрыта ў радзе галін прамысловасьці ў апошні час, патрабуе асаблівай увагі да гэтай задачы.

Спэцыялістых і кіраўнікоў па будоўлі павінны даць рабочыя і работніцы, батрацтва, калгасьнікі і калгасьніцы.

Трэба значна павялічыць пасылку жанчын у навучальныя ўстановы. Ужо зараз трэба падрыхтаваць работніц, батрачак, калгасьніц для пасылкі ўвосень на вучобу.

Але першачарговай задачай застаецца зьнішчэньне няпісьменнасьці і малапісьменнасьці, бо бяз гэтага нямысьліма далейшая вучоба.

Мы маем рад фактаў, калі прафарганізацыі нядбайна адносяцца да гэтай справы: стварылі ліквпункты, а іх работніцы дрэнна наведваюць, бо перашкаджаюць бытавыя ўмовы, а дзіцячых куткоў няма. Індывідуальнае навучаньне таксама слаба арганізавана.

А ў калгасах мы маем у радзе месц, калі цалкам жанчыны няпісьменныя.

Брыгады дэлегатак, работніц, калгасьніц, якія мы ствараем да 8 сакавіка па праверцы культурнай працы сярод жанчын, у першую чаргу павінны высьветліць перашкоды, якія мяшаюць вучобе работніц.

Няпісьменнасьць—тормаз у пабудове сацыялізму.

8 Сакавіка абвесьцім бой супроць няпісьменнасьці.

Ан-ская.

т. Кішчыцэр—мэханік ф-кі „Чырвоны тэкстыльшчык."

Арганізаваў калгас Зачысьцьскі дэлегацкі сход.

На дэлегацкім сходзе мы абгаварылі пытаньне аб практычных мерапрыемствах па суцэльнай каляктывізацыі сельсавету. Запісалася ў калгас 15 дэлегатак.

Парашылі мы стварыць брыгады дэлегатак для правядзеньня растлумачальнай працы сярод насельніцтва аб значэньні каляктывізацыі. На працягу двух тыдняў каляктывізіраваць вёску ня менш як на 60 проц. Кожнай дэлегатцы ўцягнуць у калгас ня менш аднэй бядняцкі, ці батрачкі. Абралі камісію, якой даручылі прасачыць за выкананьнем гэтай пастановы.

Праз два з лішкам тыдні дэлегаткі праверылі выкананьне прынятых пастаноў. І вось што зроблена:

23 дэлегаткі з сваімі сем'ямі ўступілі ў калгас. Акрамя таго ўцягнулі ў калгас 20 бяднячак і адну батрачку.

Але сярод дэлегатак засталося 7 чалавек, якія ня ўступілі ў калгас.

Рашуча асудзіў іх дэлегацкі сход, нават былі прапановы выключыць з дэлегатак праціўніц каляктывізацыі. Але да агульнага сходу ўсе дэлегаткі ўступілі ў калгас і падрыхтавалі яшчэ некалькі заяў ад сялян.

Зараз уся вёска каляктывізавана.

Лішэнцам, і тым, хто праводзіў работу супроць каляктывізацыі, бядняцка-серадняцкія масы далі рашучы адпор.

Так дэлегацкі сход выканаў сваю мэтавую ўстаноўку. А надалей намецілі арганізаваць да 8 сакавіка дзіцячыя ясьлі.

Барысаў. Т. О.

Гэткіх дэлегатак нам непатрэбна.

Дэлегаткі ў м. Дукора зьяўляюцца прыкладам для ўсіх неарганізаваных жанчын. Але ёсьць і такія дэлегаткі, якія ня хочуць ісьці ў калгас. Напрыклад, Мірончык П. і Ахрэмчык В.

Як абіралі працаўнікоў на ясельныя курсы, яны падалі заявы, каб іх абралі. Але дэлегаткі, усе, як адна, заявілі: „Нам гэткіх абіраць на курсы непатрэбна, яны самі яшчэ ня ўступілі ў калгас і вядуць працу па разбурэньню калгасу". Пісарчык.

Дэлегатка—актыўны змагар за пяцігодку, арганізатар ударных брыгад на прадпрыемствах, у саўгасах і калгасах. Дэлегатка—актыўны дапаможнік партыі ў справе каляктывізацыі сельскай гаспадаркі і ліквідацыі кулацтва.

Супроць рэлігіі, за індустрыялізацыю і абарону краіны.

Здаем каштоўныя рэчы і званы з царквей на індустрыялізацыю і калектывізацыю краіны. Патрабуем перадачы царквей і сынагог пад культурныя ўстановы.

У Жыткавіцкім раёне за апошні час па жаданьню працоўных



Менская чыгуначная царква. Па жаданьню працоўных перададзена пад клюб.

мас зачынены 4 царквы, адна сынагога, памяшканьні якіх пераданы пад клюбы.

У Жыткавічах на карысьць трактарнай калёны сабрана 22½ п. падсьвечнікаў, 22 залатых пярсьні, 4 пары залатых завушніц і 2 кілё срэбра.

У Навасёлках, па ініцыятыве дэлегатак камуны „Авангард" царква перадана пад клюб.

У Сянно, Віцебскай акругі, 400 працоўных жанчын аднадушна патрабавалі зачыненьня царквей і сынагог і перадачы іх пад культурныя ўстановы.

Такую-ж пастанову вынесьлі дэлегаткі **м. Дукоры**, Сьмілавіцкага раёну. Калгасьніцы Дукоры зьнялі ў сваіх хатах іконы.

45 жонак рабочых будаўнікоў у Гомелі здалі свае каштоўныя рэчы на карысьць індустрыялізацыі.

Супрацоўніцы і жонкі працаўнікоў Наркамфіну здалі ў фонд індустрыялізацыі золата 72.5 грам, срэбра 1426 грам, медзі 4.940 грам і грашыма 32 рублі.

60 жанчын **м. Узды** здалі каштоўныя рэчы ў карысьць абароны краіны.

Крычаўская арцель „Чырвоная Панчошніца" здала шэраг каштоўных рэчаў у падарунак зьезду калгасьнікаў на карысьць калякгывізацыі.

Па допісам: Анюты, Трэцьякова, Матэушавай, Мітлінай, Роберман, Пісарчык, Каліны і іншых.

Суботнік на калектывізацыю.

Па пачыну дэлегацкага сходу, чыгуначніцы станцыі Б.-Кашалеўская арганізавалі суботнік у дні каляд. Зароблены грошы парашылі здаць у фонд калектывізацыі. Раніцаю сабраліся 25 жанчын, узяліся за пашыўку мяшкоў.

Дзьве жанчыны, якія з-за малых дзяцей не маглі прыці на суботнік, прыслалі сваіх мужэй, каб прынесьлі ім дамоў працу.

Пашылі 115 мяшкоў. Зароблены 12 руб. здаем на трактарную калёну.

Мелідава.

Б. Кашалеўская.

Супроць папоўскай агітацыі.

Пурыкава, хоць і калгасьніца, і дэлегатка, але моцна апутала яе паўціньне. Таму Пурыкава выступала супроць зачыненьня царквы.

Але Цяцерская ячэйка саюзу ваяўнічых бязбожнікаў улічыла гэта: вылучаны таварышы, якім даручана праводзіць антырэлігійныя гутаркі на дэлегацкіх сходах.

Вынік добры. Пасьля гутаркі аб клясавай сутнасьці рэлігіі дэлегаткі парашылі зачыніць царкву.

Д.

Цяцерына.

Золата і срэбра на карысьць індустрыялізацыі.

Дэлегаткі пры пошце пастанавілі ўнесьці золата і срэбра на карысьць індустрыялізацыі.

Дэлегаткі: Мебель, Клябанава, Шальман, Кантэр, Сыракваша і Пятрова ўнесьлі сваё золата і срэбра на карысьць індустрыялізацыі. Астатнія дэлегаткі ўнесьлі па пяць рублёў на карысьць індустрыялізацыі.

Дэлегаткі! Бярэце з іх прыклад.

г. Барысаў. **Мебель В.**

Піанэры перавыхоўваюць мацярок.

У Людзяневічах быў вечар піанэраў. Слухалі даклад піанэр-працаўніка. Гарбуз Вульляне 45 год. Яна жыве ад Людзяневіч 5—6 вёрст і рэдка ходзіць на сходы. А на вечар піанэраў яна прышла.

У спрэчках выказваліся аб зачыненьні царквы. Вульляна раней была такога погляду: „Моладзі царква непатрэбна, а старыя нехай дажывуць пры царкве".

Паслухаўшы-ж піанэрскія выказваньні, Вульляна неўцярпела і выступіла з такой прапановай: „Ня трэба гарэлка нам і царква, бо як гарэлка, так і царква—атрута нам. Папы нам задурманівалі голавы". **С. К.**

Мазыршчына.



Каштоўныя рэчы—у фонд індустрыялізацыі.

За сацыялістычную перабудову быту.

Шпаркі рост народнай гаспадаркі, асабліва калектывізацыя вёскі, шырокае жыльлёвае будаўніцтва і рост дабрабыту працоўных—ставяць у чаргу пытаньне аб хутчэйшай перабудове быту на каляктыўных пачатках. Пераход на грамадзкае харчаваньне, будаўніцтва ясьляў, дзетсадоў—гэта адна з важнейшых задач сёньнешняга дню.

Некаторыя дасягненьні ў гэтай справе мы ўжо маем. Калі ў 1924 годзе мы мелі ў вёсцы на ўсю Беларусь толькі адну кансультацыю, 6 летніх і 7 сталых ясьляў, дык зараз у гарадох існуе ўжо 28 ясьляў, сталых ясьляў у калгасах—41 і ў савгасах—8. Палявых ясьляў у мінулым годзе ў калгасах, савгасах і ў вёсцы было 295.

Але гэтага яшчэ недастаткова: усё павялічваючыся ўдзел працоўных жанчын у вытворчасьці прамысловасьці і сельскай гаспадаркі патрабуе стварэньня шырокай грамадзкасьці да справы перабудовы быту і ў першую чаргу самадзейнасьці саміх працоўных жанчын у гэтай справе.

Зараз Жыльлёвая Каапэрацыя ў радзе гарадоў пачынае разгортваць бытавыя ўстановы. Пры жактах існуе ўжо 46 дзіцячых садоў і пляцовак, на сродкі жактаў арганізаваны 11 агульных пральняў і 3 каляктыўныя кухні



Яслі Віцебскай панчошнай фабрыкі.

Яслі калгасе.

Гэту работу трэба надалей шырока разгарнуць, поўнасьцю скарыстаўшы вызначаныя 5 проц. з выдаткаў па будаўніцтву новых дамоў і 10 проц. адлічэньня з прыбыткаў жактаў.

Работніцы, жонкі рабочых павінны арганізавацца для адшуканьня грамадзкіх сродкаў для пашырэньня культурна-бытавых устаноў у жактах па абагульваньню харчаваньня і выхоўваньня дзяцей.

Асаблівую ўвагу трэба ўдзяліць калгасам.

Зараз цяга з боку калгасьніц да стварэньня агульных сталовак, ясьляў надзвычайна вялікая.

За лік сродкаў калгасаў у мінулым годзе было створана 105 дзіцячых устаноў і 60 сталовак. Зараз, у сувязі з суцэльнай каляктывізацыяй, бытавую работу трэба значна пашырыць. Застрэльшчыкамі гэтай справы павінны быць дэлегацкія сходы ў калгасах. Дэлегаткі павінны ўзяць на сябе пачын у арганізацыі бытавых устаноў, дабіўшыся поўнага падтрыманьня ў гэтым з боку кіруючых органаў калгасу.

8-е сакавіка работніцы і калгасьніцы павінны намеціць практычныя меры па перабудове свайго быту.

Слухае радыё.

Нарабразаўскія абяцанкі.

Няма толку ў нашым дзетсадзе. Пры прыёме дзяцей ніхто ня прысутнічае. Таму маткі часта скардзяцца: то галёшы перамянілі, то рукавічкі прапалі, то хустачка згінула. Дзеткі пасьля абеду адпачываюць на сталах седзячы.

Інструктары Нарабразу на гэта адказваюць: „Грошы ёсьць і ложачкі заказаны". (Ложкаў за 2 месяцы можна нарабіць вельмі многа). Па суботах дзецям даюць есьці адзін раз і яны да 12—13 гадзін жывуць нарабразаўскімі абяцанкамі.

Адзін з пакояў знаходзіцца побач з кухняю, а таму ён увесь сьмярдзіць дымам. Зрабіць калпак на пліту кіраўнікі лічаць дорага, а паўтара-два дзесяткі дзяцей у дыму сядзяць.—Гэта нікога ня турбуе.

Два разы напаміналі Нарабразу аб непарадках, два разы ён абяцаў зьнішчыць іх, два разы намерваўся склікаць бацькаўскі сход.

Ф.

РЫХТУЕМСЯ ДА ПАСЕЎНАЙ КАМПАНІІ.

Абагулілі насеньне і жывёлу.

Дэлегаткі вёскі Шапчыц, Званецкага сельсавету, Журавіцкага р. прымаюць актыўны ўдзел у калектывізацыі. Яны пастанавілі ўступіць усім у калгас, вылучылі брыгаду з шасьці асоб. Гэта брыгада растлумачвала сялянкам жыцьцё ў калгасах. Вылучылі таксама 6 чалавек у камісію па ачыстцы і абагульваньню насеньня, маёмасьці і жывёлы. Зараз абагулена 1259 пудоў насеньня і падрыхтаваны 15 хлявоў для жывёлы.

У сучасны момант ў калгасе „Дружба“ аб'яднана 280 гаспадарак.

Падпісаліся на „Беларускую Работніцу і Сялянку“ 18 чалавек і вылучылі камісію па вярбоўцы падпішчыкаў.

Вылучана камісія з 3-х чалавек для збору попелу.

Агульны сход вынес пастанову: перадаць званы ў фонд калектывізацыі, на трактары і розныя машыны для колгасаў. Царкву перадаць пад дом культуры, а пакуль скарыстаць яе пад склады для ссыпкі зярна. Зараз усё зярно перачышчана і ссыпана ў царкве.

Краеўская.

Навучыліся ў работніц.

Мы, дэлегаткі камуны „Іскра“, Віцебскай акругі, арганізаваўшы экскурсіі ў г. Віцебск, наведалі ільнапрадзільную фабрыку „Дзьвіна“.

Мы ўбачылі, як рабочыя дружна працуюць, выклікаюць адзін-аднаго на сацспаборніцтва. У сьлясарным цэху мы бачылі работніц на кваліфікаванай рабоце.

Зьвярнуўшыся дамоў, мы на першым сходзе вылучылі на курсы некалькі жанчын, каб яны ўзьнялі сваю кваліфікацыю і сталі кіраўнікамі розных галін гаспадаркі.

Рыхтуем гародняе насеньне.

У Дукорскім сельсавеце калгасьніцы арганізавалі брыгаду для разгортваньня калгаснай працы. Асабліва актыўны калгасьніцы-дэлегаткі.

Дэлегацкія сходы шчыра ўзяліся за падрыхтоўку к вясеньняй пасеўкампаніі. Дэлегаткі ў першую чаргу ачысьцілі насеньне, абагулілі яго.

Зараз дэлегаткі заняліся зборам гародняга насеньня. Калгасы „Перамога“, „Савецкая Беларусь“ арганізавалі брыгады па збору рознай гародняй расады. Сабрана каля 2 пудоў.

Па Сьмілаўскаму раёну намечана арганізаваць 28 ясьляў, амаль столькі-ж пляцовак. Адны сталыя ясьлі адчынім к 8 сакавіка, таму зараз актывісткі яшчэ вядуць падрыхтоўку к адчыненьню ясьляў.

Сьмілавічы, Менскай акр.

Ліцьвінава.

Няма лікпункта.

У нашым калгасе вельмі кепска справа з вучобай, няпісьменных многа, а лікпункта—няма. Ніхто нават не клапоціцца аб гэтым.

Сенно, калгас „Індустрыялізацыя“.

Разваж.

Разгорнем па-баявому пасяўную кампанію. За поўнае абагульваньне жывёлы і маёмасьці ў калгасах, за ачыстку насеньня і складаньне насенных фондаў. За ўступленьне ў калгасы бядняцка-серадняцкіх гаспадарак з усімі сродкамі вытворчасьці.

Работніца, батрачка, працоўная сялянка! На барацьбу за судэльную калектывізацыю, за зьнішчэньне кулака як клясы!

Курсы батрачак Пухавіцкага р-ну, з якіх 10 чалавек падалі заявы аб уступленьні ў партыю

АБАРАНЯЦЬ СССР ГАТОВЫ.

Куем дапамогу Чырвонай арміі.

Ячэйка „Чырвонага Крыжу“ на шклозаводзе „Камінтэрн“, Бабруйскай акругі, аб'яднае ў сваіх шэрагах 300 сяброў.

З сяброў Чырвонага Крыжу быў арганізаваны гурток „Хуткае дапамогі“.

Сябры, скончыўшыя гурток, прымалі актыўны ўдзел у вопытнай мабілізацыі і манэўрах Чырвонай арміі.

У сучасны момант арганізаваны другі гурток „Хуткай дапамогі“, у якім ужо распачаліся заняткі. Акрамя новых сябраў гуртку, папаўняюць свае веды раней скончыўшыя гурток.

Для заняткаў закуплены валшэбны фанар. Адным тормазам заняткаў зьяўляецца адсутнасьць наглядных прылад. К вясьне 1930 году ў нас будзе каля 50 жанчын, добра ведаючых справу хуткай дапамогі.

Шклозавод „Камінтэрн“.

Адамовіч.

На абарону.

Жонкі супрацоўнікаў Наркамфіну сябры Асо-авіяхіму правялі самаабладаньне ў разьмеры 2-х гадовага сяброўскага ўзносу. Тутжа ў Асо ўступіла яшчэ 11 жанчын, якія абяцалі прыймаць самы актыўны ўдзел у працы ячэйкі.

Івашчанка.

Рыхтуемся да абароны краіны.

60 жанчын м-ка Узды ўступілі ў сябры Асо-авіяхіму. Арганізавалі вайскавы гурток, у які запісалася 45 жанчын.

Грынглаз.

Чырвоныя сёстры на парадзе.

Дружына Чырвонага Крыжу.

Падарунак Дальня-Ўсходняй Чырвонай арміі.

(*Фабрыка „Прафінтэрн“*).

Дэлегаткі цэха № 2 (зьмена Палавіцкага) адлічылі ў падарунак Дальня-Ўсходняй Чырвонай арміі 2 гадзіны ад свайго заробка, а дэлегаткі Фунт, Керліна, Хазан і Капулькіна па 4 гадзіны і выклікалі зьмену Ханіна пасьледаваць іх прыкладу.

Хазан Марыся.

Віцебск.

Наша праца.

Дэлегацкі сход Выдрэйскага сельсавету Высачанскага раёну сабраў у карысьць Дальня-Ўсходняй Чырвонай арміі 40 рублёў. Зараз намецілі сабраць сродкі на трактарную калёну.

Мы выклікаем усе дэлегацкія сходы нашага раёну пасьледваць нашаму прыкладу.

Высачаны.

В. Аўраменка.

Работніцы запісваюцца ў вайсковыя гуртки.

Недахопы пад абстрэл

Трэба кіраваць.

Гуртку кройкі і шыцьця работніцы і жонкі рабочых былі вельмі ады. Абяцалі на дэлегацкім сходзе, у праграму гуртка ўвесьці паліт-заняткі, санітарыю і інш.

Запісалася многа. Але, на жаль, некаторых вабіла толькі тое, каб атрымаць па кавалку паркалю; атрымалі яго і не зьявіліся больш.

Ды і ў самай рабоце гуртка многа хібаў: прыдзеш на заняткі то крэйды няма, лінейкі, машына псуецца і паліт-заняткі праводзяцца калі-ні-калі, а вось мэдыцынскіх няма, пра грамадзкія арганізацыі, як МОПР, Асоавіахім і іншыя, ніхто ні гу-гу. Няма кіраўніка, які-б арганізаваў нас на суботнік у карысьць індустрыялізацыі краіны.

Трэба ў гуртку больш разгарнуць грамадзкую работу.

Менск, Шклозавод „Пролетары".

Наведваючы.

Кепска з вучобаю.

У вёсцы Жораўка, Сьмілаўскага раёну ёсьць лікпункт, але ён не працуе. Асабліва слаба наведваюць лікпунт жанчыны.

У вёсцы Дукарка ёсьць школа малапісьменных. Школа гэта не забясьпечана падручнікамі і рознымі прыладамі.

Г. Пісарчык.

Дзе Чырвоны крыж?

Два гады існуе ў Быхаве арганізацыя Чырвонага крыжу. Але ніколі ня склікаюцца сходы гэтай арганізацыі. Савет Чырвонага крыжу не адчуваецца, самі сябры савету, мабыць, забылі аб тым, што абраны.

Старшыня Чырвонага крыжу быў на зьезьдзе, але ніхто пасьля ня чуў яго дакладу. Мабыць, старшыня лічыць, што паслалі мы яго на зьезд прагуляцца.

Пабудзіце нам Чырвоны крыж!

Зоркае вока.

Зажым самакрытыкі.

Загадчыца Езярышчанскай бальніцы груба адносіцца да хворых і служачых. Усё гэта замазвае старшыня групкому Глусевіч. Кідаюць грошы на вецер, даюць каму ня трэба. Так, Глусевіч палучыў 50 рублёў нібы за праробленую работу, хаця фактычна яе ня было.

У каляктыве працаўнікоў склока, якая цягнецца яшчэ з 1926 году. Былі выпадкі п'янства ў бальніцы.

Саюзу Мэдсанпрацы трэба зацікавіцца, што робіцца ў Езярышчынскай бальніцы.

В.

Зусім несьвядомы.

Пісаць допіс у рэдакцыю трэба падумаўшы, азнаёміўшыся з справаю. Інакш мяркуе Курыновіч Алесь з вёскі Чыжэвічы, Старобінскага раёну.

— Што там галаву ламаць— заліхвацкі парашыў Алесь, узяў 8 нумар часопісі „Беларуская Работніца і Сялянка", сьпісаў допіс М. Чулага, „Прэч шаптуноў", толькі замест вёскі Ратча напісаў ён „Чыжэвічы", шаптуну імя даў—Баранчык Хрысьціна.

Пад допісам Чулага Курыловіч падпісаў: „Сьвядомы Алесь" і размашыстым хвастком гэту подпісь закончыў.

Во як складна, галаву не ламаў і допіс напісаў.

Рэдакцыя распазнала зладзейскі ўчынак Курыловіча, допіс яго не друкавалі мы, і раім не прысвайваць назву „Сьвядомы", бо кража чужых допісаў,—справа ня толькі несьвядомая, але і злачынная.

Прэч Курыловічаў такіх з шэрагаў рабселькораў.

Чакаем адказу.

Дэлегацкі сход Гарнізоннай Пральні Саюзу Камунальнікаў просіць дэлегацкі сход Швэйнай фабрыкі паведаміць праз Беларускую Работніцу і Сялянку аб вашай рабоце на фабрыцы:

Што вамі зроблена па сацыялістычнаму спаборніцтву, ці прынялі наш выклік, як выконваеце ўзятыя абавязкі?

Падзялецеся сваім вопытам.

Гэта неабходна для далейшай нашай работы.

Магілёў. **Дэлегацкі пункт.**

ПАПРАЎКА.

У часопісі № 2 на ст. 3-й у артыкуле „Узьняць актыўнасьць калгасьніц" укралася апячатка: у радку 9 зьверху надрукавана, Калі ў 1917 годзе калгасы і савгасы давалі... трэба чытаць: „Калі ў 1927 годзе савгасы і калгасы давалі.



На фабрыцы „Дзьвіна" (Віцебск).

Тлумачэньне кіраўніку.

17 дз. Чытаньне заданьня. Вылучэньне са складаў „АД“, „ВОД“, літары „Д“. Гутарка аб аднаўленьні заводаў і фабрык, разбураных імпэрыялістымі і бандамі. Сьпісваньне знаёмых сказаў. Практыкаваньне ў напісаньні літар „Д, д“.

Пісьмовае складаньне ў межах 100. Напрыклад: 19+16; 28+35; 36+27; 74+18; 17+19+13; 22+19+9; 84+7+9.

18 дз. Гутарка аб адзінстве рабочае клясы. Чытаньне артыкулу і вылучэньне літары „Я“ і „Р“.

Пісьмовае адыманьне дзьвюхзначных лікаў, якія канчаюцца на 5 і на 0. Напрыклад: 75—20; 55—30; 100—95; 85—15; 95—45 і г. д.

19 дз. Гутарка аб плянавай рабоце. Пяцігодка. Буйная каляктыўная гаспадарка карысьней. Практыкаваньне ў чытаньні. Сьпісваньне. Чытаньне часопісі. Адыманьне двухзначных лікаў наступнага выгляду: 20—14; 40—12; 80—26; 70—27. Той лік, ад якога адымаецца, заканчваецца на 0. Гэта значыць, адыманьне ад круглых дзесяткаў. Пісаньне круглых тысяч ад 1.000 да 10.000.

20 дз. Вылучэньне „Ш“ у слове „наш“. Чытаньне артыкулу. Гутарка аб калектывізацыі і нашых цяжкасьцях. Замалёўваньне новых складаў „ЧО, ЖУ“. Сьпісваньне. Чытаньне часопісі, газэты. Адыманьне двухзначных лікаў: 28—19; 62—14; 71—63; 56—28 і гэтак далей. Увага: у аднімніку цыфра адзінак болей, чым цыфра адзінак зьменшыва. Напрыклад: ад 28—19. Тут у аднімніку ёсьць цыфра 9, у той час, калі зьменшыва мае цыфру адзінак 8.

---

17 дзень.

ЗАВОДЫ, ФАБРЫКІ, НІВЫ—НАШЫ.

Мы адабралі ў паноў нашы нівы.

Адабралі ў заводчыкаў ды фабрыкантаў нашы заводы і фабрыкі.

Аднавілі фабрыкі і заводы. Адрамантавалі машыны. Адбудавалі гарады.

Буйнымі крокамі мы будуем далей.

Будуем многа заводаў, фабрык, савгасаў, калгасаў, камун.

Заветы Ў. І. Леніна мы выканаем.

Мы будуем новы лад—Камуну.

Мы—будаўнікі Камуны.

Д, д.

18 дзень.

РАБОЧАЯ КЛЯСА—МАГУТНАЯ СІЛА.

Рабочая кляса мае сілу і веды.

Сілу рабочай клясе дала навука Ў. І. Леніна.

Леніна няма, але яго партыя жыве.

Яна кіравала і кіруе рабочай клясай.

Вось чаму рабочая кляса мае сілу.

Няма сілы магутней, як сіла рабочай клясы.

Рабочая кляса скінула ўладу цара і банкіраў.

Рабочая кляса спыніла вайну.

Рабочая кляса ўтварыла Саветы.

Партыя. Р, р. Я, я.

19 дзень.

АРГАНІЗАВАЛІ РАБОТУ ПА НОВАМУ.

Рабочая кляса арганізавана. У гэтым яе сіла.

Рабочая кляса арганізавала работу па пляну.

Сялянскі універсытэт пры Горацкай сел.-гасп. акадэміі.

Мы складаем пляны на некалькі год наперад і выконваем. Год-ад-году мы пашыраем нашу гаспадарку. Будуем новыя буйныя заводы і фабрыкі.

Будуем буйныя сельска-гаспадарчыя фабрыкі—савгасы і камуны.

Будуем калгасы—гіганты. Буйная каляктыўная гаспадарка карысна рабочай клясе, батраку, бедняку, серадняку.

Таму мы і будуем яе. Такая гаспадарка не карысна толькі кулаку ды гандляру.

20 дзень.

НАШ ДАБРАБЫТ ПАЛЕПШЫЎСЯ.

12 год таму назад мы нічога ня мелі.

Рабілі на паноў, фабрыкантаў, кулакоў.

Рабочыя, беднякі ды батракі ня мелі правоў.

Царскія ды буржуйскія законы абаранялі інтарэсы паноў ды фабрыкантаў.

Рэлігія дапамагала царскаму ўраду і дурманіла нашы галавы.

Папы, рабіны ды сэктанты балбаталі нам пра царства боскае на нейкім небе. Сулілі „рай“, каб былі мы пакорлівы.

Пужалі „пеклам і чортам“, калі мы паўставалі на цара.

За царом ды буржуямі нам сапраўды было „пекла“.

Год-ад-году мы жывем лепей. Бывае час, калі нам не хапае таго-сяго. Мы эканомім. Нам патрэбны вялікія сродкі на нашу гаспадарку. Мы будуем нашу гаспадарку ўласнымі сіламі, на свае сродкі. Агульнымі намаганьнямі мы пераможам.

ЧО, ЖУ, НАШ, Ш, ш.

Чытачкі, пішэце вашы водгукі, як вы скарыстоўваеце друкуемую намі старонку „Навучы няпісьменную“.

РАБСЯЛЬКОРКІ ПІШУЦЬ.

Лепшых актывістак у склад КСУ.

23 сьнежаня 1929 году ў вёсцы Нямойцы, Сеньненскага раёну на сходзе жанчын заслухалі справаздачу старшыні КСУ.

Указалі жанчыны шэраг недахопаў у рабоце КСУ.

Бяднячка Цімахова некалькі раз хадзіла ў камітэт па насеньне, так і не атрымала насеньня. Машыны, якія маюцца ў камітэце, знаходзяцца ня ў спраўнасьці, саламарэзкай нельга карыстацца.

У здавальненьні каапэрацыі таксама недахопы: заможныя падгаварваюць беднату і атрымоўваюць тавар па бядняцкім паям.

На гэтым сходзе вылучылі дзьвюх жанчын, якіх парашылі раіць у склад камітэту пры перавыбарах.

Сянно, Віцебскай акр.

Ганна.

Дзе-ж ачаг.

У дзень 12-й гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі ў г. Барысаве для работніц быў урачыста адчынены ачаг на 25 дзяцей.

Адна з работніц на працягу тыдню акуратна прыводзіла сваё дзіця і здавала вартаўніцы, якая справідлова гаварыла:

— Я-ж ня кіраўніца.

А кіраўніцы адказваюць:

Для аднаго дзіцяці мы ня будзем працаваць з 7 гадзін раніцы.

Вядома, што пры такім становішчы работніцы махнулі рукой на ачаг і сталі дзетак „вадзіць“ у дзіцячы сад, які працуе 6 гадзін. Гэта выклікала вялікае нездавальненьне.

Інспэктура Нарасьветы, аб гэтым добра ведае, але чамусьці мер ніякіх ня прымае.

Барысаў.

Ф.

Зьбіраюць уцільсыр'ё.

Я пазычу дзяржаве.

„Пабудуем фабрыкі і заводы, на іх будуць выраблящца розныя машыны, якія патрэбны нашай сельскай гаспадарцы“. Пачуўшы гэтыя словы, Хадосься стала прасіць мужчын, якія стаялі ўперадзе:

— Пусьцеце мяне к сталу. Я пазычу грошы дзяржаве.

З цікавасьцю паглядзелі на ўдаву. Ніхто на верыў, што яна будзе падпішчыкам на пазыку.

— Сколькі ты пазычыш?

— 2 з паловай рублі.

— У нас 5-рублёвыя аблігацыі, можна 2 жанчынам купіць адну пяцірублёвую аблігацыю.

5 жанчын падпісаліся: 4 калектыўна на 10 рублёў, адна на 5 рублёў. Сабрана ўсёй падпіскі 125 рублёў. **Адзінец Прося.**

Дайце хату-чытальню!

У вёсцы Скуратах пры самаабкладаньні пастанавілі адчыніць хату-чытальню. Вылучылі камсамолку загадваць гэтай справай. І да гэтага часу хата-чытальня на замку. Працы сярод моладзі не вядзецца.

Моладзь праводзіць вольны час над картамі, якія закупляе ў краме коопэрацыі. Каму трэба зьвярнеце на гэта ўвагу?

Навірацель.

в. Скураты, Круглянскага р-ну.

Грамадчыца—арганізатар лікбезу.

У вёсцы Валіцкаўшчыны Самахвалавіцкага раёну арганізавана ячэйка „Прэч Няпісьменнасьць“, па ініцыятыве актывісткі грамадчыцы Лукашонак Веры.

Праца пачалася. У ячэйцы 20 чалавек. Мы просім „Беларускую работніцу і сялянку“ дапамагчы ў нашай працы літаратурай.

А.

Ад рэдакцыі. Рэдакцыя раіць ячэйцы „Прэч Няпісьменнасьць“ скарыстоўваць выдаваемую намі старонку „Навучы няпісьменнага“.

ГУТАРКА З РАБСЕЛЬКОРКАМІ.

Рабселькорка—актыўная грамадчыца.

Перш, чым пісаць аб рабоце якой-небудзь установы, арганізацыі, аб іншай справе, маючай грамадзкую значнасьць,—трэба самой рабселькорцы ведаць становішча справы.

Вось **для гэтага рабселькорка штодзённа павінна быць зьвязана з усім жыцьцём прадпрыемства калгасу, з усёй працай, якая праводзіцца.**

Рабселькорка павінна зьяўляцца ня толькі наглядаючай за працай, а непасрэдным удзельнікам працы.

Нікудышная тая рабселькорка, якая толькі запісвае факты, а сама ня ўдзельнічае актыўна ў наладжваньні, нават арганізацыі работы, якая на месцы не змагаецца з недахопамі ў рабоце.

„Пачакай, вось яна пра цябе ў газэту напіша"—гавораць некаторыя.

Трэба ведаць, што газэта ня пугала, а праз друк мы змагаемся з недахопамі ў нашай рабоце. Друк дапамагае арганізаваць грамадзкую думку вакол таго ці іншага моманту нашай работы.

Рабселькорка, як актыўная грамадчыца, зьвязаная з масамі усёй правадзімай работай, добра ведае жыцьцё свайго цэху, фабрыкі, калгасу, савгасу, устаноў і арганізацый. Рабселькорка праз друк асьвятляе дадатныя бакі работы, рашуча змагаецца як праз друк, так і на месцы, з рознымі недахопамі.

Рабселькорка, як перадавічка, ні ў якім разе не пляцецца ў хвасьце адсталых мас, а сочыць за тым, каб дырэктывы партыі і савецкай улады праводзіліся правільна.

Рабселькорка—актыўны змагар з бюракратызмам, цяганінай, безгаспадарчасьцю, парушэньнем клясавай лініі, прагульшчыкамі, гультаямі і іншымі скрыўленьнямі лініі кампартыі.

Дапаможнікі ў рабоце рабселькоркі—уся маса працоўных, з якімі рабселькорка неразрыўна і штодзённа зьвязана.

А. Г.

Ад рэдакцыі. З мэтаю дапамогі ў працы нашых рабселькорак і выхаваньня новых кадраў іх з ліку нашых чытачак,—у часопісі будзе адведзены сталы куток. „У дапамогу рабселькоркы". Тут будзе надрукавана шэраг гутарак аб працы рабселькорак.

Таварышы-чытачкі! Пішыце, па якім пытаньням працы рабселькорак вы-б жадалі атрымаць тлумачэньне.

Падрыхтоўка да перавыбараў у Саветы—складаюць сьпісы лішэнцаў.

Да ўсіх чытачак і ўпаўнаважаных часопісі.

У сувязі з перагрузкай друкарні, па тэхнічным прычынам №№ 1—4 часопісі за студзень—люты вышлі з спазьненьнем. З мэтай сваячасовага выпуску часопісі Рэдакцыя выпускае ў лютым двайны нумар № 5—6.

З сакавіка часопісь будзе выходзіць сваячасова, па 3 нумары ў месяц. Ня гледзячы на паведамленьне ўпаўнаважаныя працягваюць дасылаць падпісную плату з разрахунку 15 кап. у месяц.

Рэдакцыя растлумачвае, што падпісчыкі здаўшыя падпіску на 1930 год да студзеня будуць атрымліваць па старай цане, а астатнія з разрахунку 20 кап. у месяц.

Тым падпісчыкам, якія паслалі пасьля 10 студзеня падпісную плату рэдакцыя будзе высылаць часопісь па новай цане.

„Беларуская Работніца і Сялянка"

з студзеня 1930 году выходзіць 3 разы ў месяц.

Падпіску можна здаваць на пошту, лістаносцам, у кіёскі ці прысылаць непасрэдна ў рэдакцыю.

Часопісь каштуе— у месяц: . . . . 20 капеек | Паўгода. . . 1 р. 20 капеек
3 месяцы . . . 60 „ | Год . . . . 2 р. 40 „

Цана асобнага нумару 10 кап.

Упаўнаважаныя па падпісцы атрымоўваюць 10 проц. з сабранай сумы.

Кожная актывістка, грамадчыца, дэлегатка, работніца, калгасьніца, саўгасьніца, бяднячка і серадняцка—павінна чытаць сваю часопісь „БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА і СЯЛЯНКА".

Кожная актывістка павінна распаўсюджваць гэту часопісь.

Чытайце, распаўсюджвайце і пішэце ў сваю часопісь.

Адрас рэдакцыі: Менск, вул. Карла Маркса, 14, тэлефон—5-85.

Паштовая скрынка.

Людзьвігоўскай.—Допіс—друкаваць ня будзем—агульныя разважаньні. Напішыце больш падрабязна, якая масавая работа праводзіцца сярод жанчын, як яны ўдзельнічаюць у падрыхтоўцы да веснавой сяўбы.

Л.—Аб працы сярод жанчын напішыце ў насьценгазэту.

Ліцьвінавай.—Тэрмінова прышліце адрасы тых, хто не атрымоўвае часопісь.

М. Берман.—Аб Шустэрман напішыце ў насьценгазэту.

Коцік.—Пішыце, як праводзяцца ў жыцьцё пастановы канфэрэнцыі калгасьніц.

Ганьне.—Дайце прыклады ігнараваньня дэлегатак установамі. Дзе гэта дэлегаткі дапамаглі школе?

Піскуну.—„Жанарганізатар не працуе"—друкаваць ня будзем, бо праверка факту даказала, што допіс не адпавядае сапраўднасьці.

Дшэга.—Аб васкресьніку—напішыце ў насьценгазэту.

Жанчыне.—Ваш допіс перасланы ў „Беларускую Вёску".

Кульша.—Пішыце, якую пастанову прыняў сход работніц, і як выконваецца пастанова самімі работніцамі? Чым тлумачыцца слабы ўдзел работніц у каляктывізацыі вёскі?

Пракаповіч.—Пішыце, як справа з абагульваньнем насеньня і жывёлы. Як калгасьнікі рыхтуюцца да вясновай сяўбы?

Самсончык.—Пішыце, якую работу праводзяць дэлегаткі па ўцягненьню ў калгас астатніх батрачак, бяднячак і сераднячак.

Хліманову.—У чым выяўляецца практычная грамадзкая работа тав. Дубінскай?

Явару.—Частушкі слабыя—друкаваць іх ня будзем.

Калгасьніцы.—Ваш допіс накіраваны ў газэту „Зьвязда".

Групе дэлегатак.—„Наша грамадчыца"—друкаваць ня будзем. Пішыце, як уся маса працоўных жанчын удзельнічае ў справе каляктывізацыі.

М. Чабор.—частушкі—друкаваць ня будзем—слаба распрацована. Допіс „чакаем агронома"—накіраваны ў „Бел. Вёску".

Аб жанпрацы—напішыце ў насьценгазэту. Аб ліквбезе таксама друкаваць ня будзем, бо за апошні час мы мелі ад вас 2 допісы пра становішча ліквбезу і яны супярэчаць адзін аднаму. Такім чынам, з вашых лістоў нельга распазнаць, працуе ў вас ліквбез, ці не.

Ракіце.—Допіс—„Жанчына ў калгасе"—друкаваць ня будзем. Агульныя разважаньні.

Айзінай Ані.—Пішыце, як работніцы ліквідуюць сваю непісьменнасьць і ўдзельнічаюць у палепшаньні вытворчасьці.

Навінкавай.—Пішыце, як праявілі сябе работніцы ў сацспаборніцтве, аб удзеле работніц у шэфтаварыстве і дапамозе ў каляктывізацыі падшэфнай вёскі.

Замасьціновіч.—Пішыце, якая практычная работа праведзена брыгадай.

Алейчыку.—„Падтрымаем ініцыятыву"—друкаваць ня будзем. Напішыце аб гэтым у насьценгазэту.

Пішыце нам, як арганізавана справа падрыхтоўкі жанчын да абароны краіны.

Дэлегатцы.—Пішыце больш падрабязна, якую працу правяла вылучаная брыгада і з каго яна складалася. Напішыце аб становішчы ліквідацыі непісьменнасьці сярод сялянак.

Савуткін.—Ваш допіс перасланы ў „Зьвязду".

Бунінай.—Аб чырвоным кутку напішыце ў насьценгазэту.

Каліне.—„Не забудзьцеся сялянкі" і „І вам трэба" друкаваць ня будзем. Вы спрабавалі пісаць у вершаванай форме, але вершы вам не ўдаюцца. Акрамя гэтага, па зьместу зусім нельга зразумець, якую-ж думку вы жадалі прывесьці.

Дорскаму.—Допіс друкаваць ня будзем. Вы пішаце: „наведваньне гурткоў здавальняючае". Слова „здавальняючае"—нічога ня кажа чытачам. Замест гэтага трэба было падрабязна напісаць, як працуе лікпункт, што зроблена для лепшага правядзеньня, ці перашкаджаюць вучобе дзеці, пасьпяваемасьць.

Астаф'евай.—Пішыце, як выконваецца пастанова аб ліквідацыі няпісьменнасьці, уступленьні ў калгас і выпісцы часопісі.

Пра дэлегатку-актывістку, якая вельмі прыхільна да царквы, трэба напісаць у насьценгазэту.

Явар.—Вершы вельмі слабыя, друкаваць іх ня будзем. Напішыце лепш допіс, як савгас рыхтуецца да вясновай сяўбы.

Лінкінай.—Пішыце, якая выхаваўчая работа праводзіцца ў гуртку кройкі і шыцьця.

Явару—Пішыце, больш падрабязна аб брыгадах савгасьніц, выехаўшых для дапамогі ў каляктывізацыі.

Ліпоўскай.—Аб уступленьні ў партыю напішыце больш падрабязна: як праявілі сябе на грамадзкай рабоце падаўшыя заявы ў партыю, хто яны: батрачкі, бяднячкі—калгасьніцы. Якая выхаваўчая работа праводзіцца сярод батрачак і калгасьніц?

Старайцеся пісаць больш разборчыва.

Язэпу Ракіце.—Пра кіно друкаваць ня будзем.

Бачыўшай.—Допіс аб Цімашысе—друкаваць ня будзем. Напішыце аб гэтым у насьценгазэту.

Прысутнічаўшаму.—Напішыце больш падрабязна, як дэлегаткі ў калгас уступілі. Вядома, што аб'яднаньне ў калгас зьявілася вынікам ня толькі аднаго дакладу. Таксама напішыце, як выконваецца пастанова аб уступленьні ў ячэйку саюзу ваяўнічых бязбожнікаў і наведваньні антырэлігійных гурткоў.

М. Чабор.—„Сход сялянак" друкаваць ня будзем. Агульныя разважаньні: „Сабралася многа. Сход адбыўся ў сельсавеце. Ва ўсіх вясёлы настрой". Гэтыя словы нічога цікавага не даюць чытачу.

Пішыце лепш, як разгорнута выхаваўчая работа ў калгасе. Як ідзе падрыхтоўка да веснавой сяўбы.

Ганьне.—Па пытаньню аб жанчынах у калгасе мы ўжо даўно пісалі. На падставе нашага матар'ялу правядзіце большае тлумачэньне ў калгасах.

Пішыце аб павышэньні кваліфікацыі калгасьніц, аб уступленьні ў партыю і выхаваўчай рабоце сярод калгасьніц і камунарак.

Н. Мельнікавай.—Зборнікаў узораў крыжыкамі зараз у магазынах Менску няма. Можаце выпісаць праз магазын Белдзяржвыдавецтва (рог Ленінскай і Савецкай) кніжку па дамаводзтву, там ёсьць абразчыкі для рукадзельляў.

На запытаньне, як пісаць у нашу часопісь, мы адказваем. Нас зараз цікавяць пытаньні працы грамадчыц, вылучэнак, удзел працоўных сялянак у каляктывізацыі вёскі, ахоп батрачак, калгасьніц і працоўных сялянак лікпунктамі, уступленьне ў партыю батрачак і калгасьніц. Нас таксама цікавяць умовы працы і быту калгасьніц і саўгасьніц. Вось гэтыя пытаньні вы вывучыце на месцы і напішыце нам аб іх, толькі канкрэтныя прыклады трэба прыводзіць, назваць мясцовасьць і людзей, аб якіх гавораць.

Ласкевіч.—Калі Вы нездаволены рашэньнем, дык маеце права падаваць скаргу ў акруговую выбарчую камісію.

У гэтым нумары ўсім падпішчыкам рассылаецца выкрайка дзіцячай сукенкі, малюнак сукенкі і тлумачэньні будуць у наступным нумары.

У нашым пакоі

Цёпла, весела і люба
У пакоі нам, пры клюбе.
Колькі хочаш у нашым пляцу
Кніжак, мячыкаў і цацак,

Абручоў і іншых рэчаў.
У клюбе-ж мамы, кожны вечар
У вялікай залі, радам—
Ходзяць, слухаюць даклады,

Гутараць, чытаюць кніжкі.
А тым часам, мы, малышкі,

Каб усюды не валялісь,
Не мурзаціліс, ня мялісь.

У пакоі нашым сьветла,
Чыста, радасна і ветла.
Тут пяем мы, ладзім гульні.
Лепш,як дома,тут,прытульней.

На двары—сьняжок і лёд.
Нам—цяпло. Мы ладзім „сход".
Старшынёй абралі Іну,
Побач села Акцябрына.

Вілі-ж, Зорачцы і Клары
Даручылі гаспадарыць:

Цацкі ў скрынкі ўсе складаць,
І пясок не рассыпаць.
А Нінэлі, большай крышк
Даручылі чытаць кніжку.

Усім хапіла нам работы.
І таму, мы ўсе з ахвотай
Ходзім у наш пакой пры клю
Тут нам весела і люба.

Ладзім гульні на дыване,
Ім пакойчык наш засланы.



Нам чытала цёця Вера
Кніжачку пра піанэраў.
А пасьля, мы з цёцяй Валяй
Ўсе малюнкі разглядалі.

Наляпілі самі з гліны
Місак, кошыкаў з малінай,
Птушак, конікаў і кошак,
Назьбівалі скрынак з дошчак

Ў скрынкі мы складаем лоўка
Краскі, сшыткі і алоўкі,

Мая, з дзіцячага саду,—
Выступае ў нас з дакладам.
Парашылі сходам усе мы
Ў санкамісію абраць Рэму,

Мюда, Лену, Кіма, Волю,
Зору,—каб сачылі болей
За парадкам, чыстатою,—
Дзецям чысьценькай вадою

Трэба мыцца, нос уціраць,
Ногці часта падстрыгаць.

Нашы „справы" вырашаем,
Мамам нашым не мяшаем.
Мамам вольна, нам таксама,
Добра між дзяцей часамі.

Мамы, ладзьце нам пакоі!
Не мяшацьцем пад рукою,
Надакучаць вам ня будзем,
З нас узрастуць новыя людзі.

Нам з пакою, проста дзьверы
Ў акцябраты й піанэры.

А—г.

ГПБ Ср. Аз.

Работніцы, працоўныя жанчыны, актыўна змагайцеся за пабудову новага сацыялістычнага быту, за грамадзкае выхаваньне дзяцей, стварэньне грамадзкага харчаваньня. Разгорнем дашкольны паход!

Выдавец—Аддзел работніц і сялянак ЦК КП(б)Б. *Рэдактары:* Н. Бурава. Г. Рагазіньнікава.

Друкарня БДВ. Заказ № 1297 У ліку 21.300 экз. Галоўлітбел № 857.